РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 МАЯ 2025 г. СЕРАДА № 87 (30475)




Фота БелТА.

# «НЯЗМЕННАЙ ЗАСТАЕЦЦА ВЕРА І АДДАНАСЦЬ ТЫМ ЛЮДЗЯМ, ЯКІЯ ЗДЗЕЙСНІЛІ ПОДЗВІГ У ІМЯ НАС»

**9 мая 1945 года — дата, якая прынесла чалавецтву вызваленне ад фашысцкай навалы. Значэнне гэтага дня ў сусветнай гісторыі і гісторыі нашай краіны пераацаніць немагчыма. І з кожным годам яно толькі ўзрастае, бо зноў падымае галаву фашызм, які, здавалася, у маі 1945-га назаўжды затапталі ў зямлю. У гэтай бітве святла і цемры мы зноў на перадавой. І галоўная наша зброя — наша памяць, якая не прадаецца, наша веданне, якое ў кожнай сям'і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Гэта важна, гэта пытанне нашага выжывання. Аб гэтым зноў гаварыў Прэзідэнт на ўрачыстым сходзе з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі, які прайшоў у Палацы Рэспублікі.**

(Працяг на стар. 2–6)

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

## НАША СЛАВА, НАША ПАМЯЦЬ, НАШ ГОНАР

Матэрыяльная дапамога ветэранам Вялікай Айчыннай вайны выплачваецца з 2 да 8 мая і на ўчарашні дзень яе атрымалі 97 % адрасатаў. Для ўдзельнікаў і інвалідаў вайны яна складае сёлета 5 тысяч рублёў, для іншых катэгорый ветэранаў — 2,5 тысячы, для асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, — 1,5 тысячы. Як паведаміў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай АРОЛ, летась памеры дапамогі былі павялічаны ўдвая, сёлета — яшчэ на 20 %. На гэтыя мэты з бюджэту выдаткавана каля 13 мільёнаў рублёў, а дапамогі ахопяць больш за 7 тысяч чалавек. Раскажаем, якія мерапрыемствы запланаваны на 9 Мая ў сталіцы і іншых гарадах.

СТАР. 8–9

# «НЯЗМЕННАЙ ЗАСТАЕЦЦА ВЕРА ЯКІЯ ЗДЗЕЙСНІЛІ

## Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстым сходзе,



Дарагія сябры! Паважаныя суайчыннікі! Госці нашай Беларусі!

На пачатку звароту хацеў бы падзяліцца з вамі актуальнымі думкамі. Крыху я закранаў гэту праблему, знаходзячыся нядаўна ў Сталінградзе (сучасная назва горада — Валгаград. — **«Зв.»**). І ўпэўнены, што пераважная большасць гэтай залы, гледзячы тэлевізар, слухалі гэта выступленне.

Што называецца, мяркуйце самі.

Мінула 80 гадоў з таго вялікага дня, калі нашы савецкія войскі зламалі хрыбет самаму небяспечнаму і страшнаму ворагу мінулага стагоддзя. 80 гадоў. А мы? Ствараем мемарыялы, комплексы: Хатынь, Ала, Чырвоны Бераг, Брэсцкая крэпасць, Буйніцкае поле. Мадэрнізуем ужо каторы раз, укладваючы каласальныя сродкі. Узводзім помнікі, якія таксама будуем, перабудоўваем, прыводзім у парадак, даглядаем іх. Курган Славы, плошча Перамогі, помнік гораду-герою Мінску.

**Па крупінках збіраем факты перамог і жахаў той вайны. Ідзём да гэтых помнікаў, мемарыялаў, вядзём за руку за сабой дзяцей. Вучым у школе, у ВНУ, глыбока ўнікаючы ў тую вайну, адшукваючы той нерв, дзякуючы якому мы перамаглі.**
**Наогул праводзім тысячы мерапрыемстваў, здымаем фільмы, пішам артыкулы. Навука займаецца тымі мінулымі гадамі і нашай Перамогай.**

І ў кожнага сваё стаўленне да гэтых гадоў і да гэтай вайны. Наша грамадства калі не падзелена... Хаця, можна сказаць, і падзелена на некаторыя групы. Вялікія групы. Для некаторых тое, што я сказаў, з'яўляецца натуральным. Бо яны не толькі бачылі жахі гэтай вайны. Іх няшмат ужо засталося, на жаль. Рух часу няўмольны. Але некаторыя з іх трымалі зброю ў руках і ваявалі. Таму для іх тая вайна і тая Перамога, пра якую мы сёння гаворым, учора і заўтра будзем гаварыць, упэўнены, — натуральны ход падзей з пункту гледжання таго, што яны самі з'яўляліся стваральнікамі гэтай самай Перамогі.

Іншая частка (і я сябе таксама адношу да гэтай часткі) — мы, дзеці тых, хто ваяваў. Мы слухалі і чулі жахі гэтай вайны. Для нас яна недапушчальная. Яна для нас проста непрымальная. Можна сказаць, у нас гэтыя аповеды (мы і фільмы па-асабліваму ўспрымаем, факты), яна ў нас у крыві.

Ёсць нашы дзеці, якія, натуральна, не бачылі гэтай вайны. Яны не чулі расказаў тых, хто прайшоў праз гэта гора, праз гэту вайну. Яны бачаць гэта па нашых помніках, музеях. Яны ўспрымаюць гэта настолькі, наколькі мы ім гэта паднясём. І зусім малыя, школьнікі і гэтак далей.

І ўсе гэтыя катэгорыі, групы людзей парознаму ўспрымаюць гэту вайну і нашу Перамогу, як і тое, што здарылася ў жыцці наогул, кожны ўспрымае па-свойму.

Ёсць, праўда, яшчэ адна група людзей. Ці варта пра яе сёння казаць? Да яе адносяцца нашы збеглыя і тыя, хто сёння атрымаў у спадчыну ген фашызму. Тыя, хто збег за акіян і далей. Яны адтуль нам раяць.

**Паўстае заўсёды пытанне (давайце не будзем у гэты святы дзень падманваць сябе): можа, не трэба (святкаваць Дзень Перамогі. — «Зв.»)? 80 гадоў. Можа, не трэба? Нашто ўсё гэта? Як некаторыя прыгожа адтуль нам раяць, я ўжо сказаў, вельмі прыгожа кажуць: «Няхай яны спакойна спяць». Тыя амаль 30 мільёнаў савецкіх людзей ды іншых з Еўропы. 30 мільёнаў загінулых кітайцаў, якія змагаліся супраць японскага мілітарызму. 30 мільёнаў. А ўвогуле ўжо называюць лічбу ад 70 да 100 мільёнаў загінулых у Другой сусветнай вайне.**

80 гадоў. Яшчэ раз паўтараю, можа, хопіць? Можа, не трэба? Навошта ўсё гэта: мерапрыемствы, урачыстыя сходы і неўрачыстыя, парады, часам з рызыкай (асабліва гэта актуальна сёння для Масквы). Можа, сапраўды няхай спяць спакойна?

Тым больш, будзем шчырыя, некаторыя з нас робяць гэта фармальна. На мой вялікі сорам і жаль, мае падначаленыя. Прамыя падначаленыя, можа, апасродкавана праз некага. Дзяржаўныя служачыя, якія арганізоўваюць гэтыя мерапрыемствы па разнарадцы (гэта недапушчальна, асабліва калі гэта датычыцца дзяцей і моладзі): трэба вось столькі — ну, выдзелім такую колькасць людзей, пойдзем сходзім да помніка. Не хачу нават называць дарэмна гэтыя помнікі.

Робяць не ад душы, не ад сэрца. Ёсць і такія сярод нашага брата. Таму яшчэ больш важнае і актуальнае пытанне: можа, хопіць? Не, дарагія мае, не хопіць! Не хопіць таму, што мы гэта робім, каб не паўтарылася гэта болей.

**Я ўжо казаў у Хатыні: забудзем дарогу да помнікаў, забудзем дарогу ў Хатынь — гэта да нас прыйдзе. Мы гэтага не хочам. Аб гэтым я казаў на святой сталінградскай зямлі. Мы гэтага не хочам! Таму мы ўсё гэта рабілі, робім і будзем рабіць.**

*(Апладысменты.)*







# І АДДАНАСЦЬ ТЫМ ЛЮДЗЯМ, ПОДЗВІГ У ІМЯ НАС»

## прысвечаным 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне

Гэта адказ тым, хто нас прыгожа ці ўтупую, імкнецца адвярнуць ад гэтай Вялікай Перамогі. А калі паўторыцца? А калі паўторыцца — каб мы разумелі, што да нас былі людзі, якія, не шкадуючы свайго жыцця, усяго святога, што ў іх ёсць, абаранялі гэту зямлю, абаранялі сваю краіну. Абаранялі сваіх родных, блізкіх, дзяцей, каханых. І яны паказалі нам прыклады гэтай абароны.

Яны ж свядома часам ішлі на шыбеніцы. Яны сваімі грудзьмі закрывалі доты. Яны ваявалі і гінулі, часам свядома разумеючы, што ён загіне. Яны ішлі не баючыся. Гэта прыклады для нас. І яны сёння за мяжой гэтага страшна баяцца. Гэтага страшна баяцца.

Вазьміце, — я ўважлівым чынам назіраю, паглыблены ў спецыяльную ваенную аперацыю Расіі супраць Украіны. Заточаныя расійскія воіны ваяваць супраць нацызму свайго жыцця не шкадуюць. Чаму, адкуль? Адтуль. Вось гэтага тыя, хто сёння бразгае зброяй на нашых граніцах, больш за ўсё баяцца.

Таму ў Сталінградзе я і казаў: для таго, каб ім (апанентам за мяжой. — **«Зв.»**) развязаць супраць нас вайну, трэба найперш адабраць у нас памяць і галовы. Як толькі яны зробяць (можа, гэта пасля мяне ўжо будзе), чакайце новай вайны.

Таму мы ваюем, мы сёння змагаемся. Гэта вайна, казаў у Сталінградзе расіянам, яна пачалася ўжо. Але гэта сучасная вайна, якая пачалася ў сродках масавай інфармацыі. За розумы і сэрцы, за галовы нашых людзей. Яна, гэта вайна, пачалася, і мы яе сёння вядзём. Дзякуй богу, пакуль спраўляемся.

І па-чалавечы. Ну, большасць вернікаў, так? Ну, можа, і няверуючыя ёсць. Ёсць напэўна. Але і вернікі, і няверуючыя — усе выдатна разумеюць, што мільёны людзей, якія пайшлі ад нас тады, яны там — на нябёсах. І вернікі, і няверуючыя пагодзяцца са мной, што з часам і мы будзем там. Такое жыццё. І як яно будзе, калі мы з імі сустрэнемся? Калі мы не будзем цаніць іх подзвіг, калі мы не будзем шанаваць іх памяць, калі мы не будзем ім дзякаваць кожны дзень за той подзвіг, які яны здзейснілі ў імя нас перш за ўсё, каб мы жылі? Якімі вачыма мы будзем тады глядзець на іх? Гэта проста па-чалавечы.

**Таму мяркуйце самі. Наша жыццё, нашы дзеці ў тым ліку, будуць ацэньваць так, як мы ацэньваем і беражом памяць аб сваіх бацьках. Таму, калі мы хочам, каб новае пакаленне, нашы дзеці і ўнукі да нас ставіліся з павагай, мы павінны шанаваць гэту памяць. Памяць і гэтых людзей, якія аддалі жыццё ў імя нас.**

*(Апладысменты.)*

Паважаныя сябры!

Я казаў аб васьмідзесяці гадах невыпадкова. Мы, вы заўважылі, вельмі актуалізавалі гэту тэму. Мы як ніколі раней гаворым сёння аб гэтай Вялікай Перамозе. Чаму? Таму што яны (апаненты. — **«Зв.»**) рыхтуюцца да вайны. І гэта ўжо на нашых граніцах.

Я не хачу вас запалохваць, вы не хвалюйцеся, вайны заўтра не будзе. Але навошта траціць мільярды долараў нашай славянскай суседцы на зброю? Ну навошта зброя, навошта такія грошы траціць, каб у галечы жылі свае людзі, калі ты не збіраешся ваяваць? Пытанне рытарычнае.

**Яны хочуць сёння таму адабраць нашу памяць. Яны хочуць забраць галовы нашай моладзі найперш. У нас галовы яны ўжо не забяруць. Нашы галовы забіты памяццю аб Вялікай Перамозе. З моладдзю працуюць. Не скажу, што не атрымліваецца. Недзе нешта выходзіць. Але наша грамадства ад малога да вялікага, як раней казалі, як ніколі сёння маналітнае і адзінае. Мы, перажыўшы 2020 год, крыху зразумелі, што можа быць. Бачачы тое, што адбываецца на поўдні ў нашай братняй Украіне, мы тым больш разумеем, які страшны лёс гэтай вайны. І мы гэтага дапусціць не павінны.**

Таму мы павінны дакладна разумець: калі мы выдужаем сёння ў барацьбе за розумы і сэрцы нашых людзей, нашых дзяцей, нашай моладзі, мы абыдземся без вайны.

А вось заваяваць сэрцы і розумы нашых маладых людзей без той сістэмнай работы, якую мы сёння праводзім (з памылкамі, недахопамі, натуральна), мы не зможам. Моладзь сёння, як усе кажуць, вельмі добрая. Але гэта не тая моладзь, якімі былі вы — выхаванымі і выгадаванымі ў працы. Наша моладзь розная. Ёсць выдатныя людзі, якія разумеюць, як жыць. А ёсць, як я кажу часта, тыя, якія лічаць, што ў тэлефонах, айфонах растуць бананы і бульба.

Таму мяняецца аблічча нашага грамадства, мяняюцца людзі. І падыходы нашы мяняюцца ў сувязі з гэтым. Але нязменнай застаецца вера і адданасць тым людзям, якія здзейснілі подзвіг у імя нас.

І сёння мы з вамі сабраліся, каб адсвяткаваць чарговы раз гадавіну Вялікай Перамогі. Перамогі, у гонар якой 9 мая 1945 года радаваўся ўвесь свет. 80 гадоў таму ўвага ўсяго чалавецтва была прыкавана да нашай краіны — Савецкага Саюза, дзяржавы, якая знішчыла фашысцкую Германію, «тройчы праклятую», як пісала ў гэты дзень наша «Советская Белоруссия».

Мы не забыліся. Праз многія-многія дзесяцігоддзі. Я хачу, каб яны там (за мяжой. — **«Зв.»**) пачулі: мы не забыліся, мы не забудзем, мы ўдзячныя людзі. Хаця наўрад ці знойдзецца той аб'ём удзячнасці, які мы можам пакласці ў знак падзякі за іх подзвіг.

**Святкуючы Дзень Перамогі, кожны год мы ў думках вяртаемся ў мінулае — невыносна балючае і бяспрыкладна гераічнае. У ім урокі, якія дапамагаюць нам глядзець на сваю гісторыю, сваю сучаснасць і сваю будучыню. І глядзець без ілюзій!**

**Нам, славянам, як і астатнім «не арыйцам», няма месца ў будучыні, аб якой мараць заходнія эліты, што змяняюць адна адну. Гэта і ёсць мэта, на аснове якой і сёння квітнее ідэалогія нацызму, шавінізму і расізму.**

Нам прысуд быў вынесены задоўга да пачатку германскага ваеннага ўварвання. Задоўга да чэрвеня 1941-га. Прывядзенне яго ў выкананне на беларускай зямлі расцягнулася на страшныя 1132 дні.

І праз 80 гадоў маштаб страт рэжучым болем аддаецца ў нашым сэрцы. Гавораць, больш за 28 мільёнаў савецкіх грамадзян. Гэты абсалютна прыкладная лічба на сённяшні дзень. Рэальная — значна большая.

Мы яшчэ не ўсе магілы знайшлі. І ў Беларусі, і ў Расіі. Не кажучы пра тыя краіны, улады якіх вядуць іншую статыстыку: ускрываюць, знішчаюць і хаваюць сляды злачынстваў нацыстаў.

Мы ўжо ніколі не палічым пакараных смерцю, чые астанкі акупанты на бягу, уцякаючы адсюль, адкопвалі, спальвалі, перамолвалі гусеніцамі танкаў, раўняючы пыл з зямлёй. Палілі і ўліковыя кнігі, якія вялі з нямецкай педантычнасцю, фіксуючы кожнага забітага.

З улікам раскрытых новых пахаванняў масава забітых людзей на тэрыторыі рэспублікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны мы гаворым аб кожным трэцім. Але, баюся, калі-небудзь скажам аб кожным другім. Нам хаваць няма чаго.

**Урок засвоены. Вялікая Айчынная вайна — далёка не першае ўварванне ў славянскі свет з Захаду, які невылечна пакутуе хваробай уласнай перавагі. Пад шырмай рэлігійных і ідэалагічных разыходжанняў да нас, беларусаў, і праз нас тады і стагоддзямі раней ішлі «вызваляць» шырокія і багатыя на рэсурсы землі. Вызваляць ад каго? Ад нас. Пад свае народы. Пад будучыню, але ўжо без нашага славянскага свету. Нас нават як калонію тады не разглядалі. Гэта быў генацыд. Вытрыманы і цынічны.**

Апошні паход аб'яднанай свастыкай Заходняй Еўропы на ўсход па сваёй жорсткасці перасягнуў усе вядомыя ў гісторыі войны. Але маштаб усенароднага супраціўлення прывёў працаўніка ў шок. Шакіравалі ўзятыя ў палон байцы і падпольшчыкі, якія не вымавілі ні слова пад дзікімі катаваннямі. Салдаты, якія закрывалі грудзьмі кулямёты. Лётчыкі, якія накіроўвалі знішчальнікі і бамбардзіроўшчыкі на варожыя калоны. Яны (за мяжой. — **«Зв.»**) гэтага не разумеюць, як гэта можа быць.

Заканчэнне на стар. 4 ►





# «НЯЗМЕННАЙ ЗАСТАЕЦЦА ВЕРА І АДДАНАСЦЬ ТЫМ ЛЮДЗЯМ, ЯКІЯ ЗДЗЕЙСНІЛІ ПОДЗВІГ У ІМЯ НАС»

*(Заканчэнне.
Пачатак на стар. 2—3)*

Мы ведаем, што ў кожнага подзвігу мужчынскі і жаночы твар, часта юны, а то і зусім дзіцячы. У тых подзвігаў ёсць і дзіцячыя твары. Нашы піянеры — маленькія героі вялікай вайны — мужна ваявалі побач з дарослымі — старэйшымі братамі, бацькамі і дзядамі. Са ста беларускіх хлопцаў прызыўнога ўзросту на момант пачатку вайны выжылі толькі трое.

Шакіравалі акупантаў мірныя жыхары, якія хавалі ў сваіх дамах яўрэйскіх дзяцей і параненых чырвонаармейцаў, ведаючы, што за падобнае вешалі на шыбеніцы цэлымі сем'ямі. Не разлічваў вораг, што сутыкнецца з беспрэцэдэнтна самаадданай працай для патрэб фронту савецкіх жанчын, старых і дзяцей, якія замянілі мужчын, што пайшлі на фронт. А вось ім у тыле было часам яшчэ больш складана. Галодныя, даведзеныя да знямогі, яны ваявалі, у іх быў свой фронт. На фронце — так, ваявалі, гінулі, хацелася жыць, але хоць кармілі... А яны ў тыле, галодныя, рабілі для фронту ўсё, што маглі і нават не маглі.

**Беларусь панесла незаменныя страты. Але мы памятаем: нашы героі сышлі, каб мы, наступныя пакаленні, ніколі не спазналі боль страт і гора. Яны пайшлі, каб мы маглі нарадзіцца. Каб мы жылі. Таму Беларусь памятае!**

*(Апладысменты.)*

Мы бясконца ганарымся самаадданымі людзьмі, якія прынялі ўдар ля сцен Брэсцкай цытадэлі, якія да смерці стаялі на подступах да Мінска і Магілёва, у балотах і багне Палесся. Тут, на роднай зямлі, насуперак страшным стратам зараджалася воля да перамогі. Фотаздымкі дзясяткаў спаленых нямецкіх танкаў на Буйніцкім полі, апублікаваныя ў першыя месяцы вайны, далі савецкаму народу веру ў тое, што вораг будзе разбіты. Лёгкай перамогі, як на захадзе Еўропы, не будзе.

І Беларусь змагалася. Змагалася на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі.

Мы ведаем, што жывём на няскоранай зямлі. Не было ні дня, каб вораг адчуваў сябе тут гаспадаром: у яго стралялі руіны, лясы, балоты, яры і падвалы.

**Мы не стамляемся дзякаваць народам савецкіх рэспублік, чые сыны і дочкі змагаліся за кожны метр беларускай зямлі як за свой родны дом. Мы, беларусы, ніколі не здрадзім гэтаму загартаванаму ў баі братэрству. Імёны паўшых герояў назаўжды засталіся ў нашым жыцці.**

*(Апладысменты.)*

Дарагія сябры!

Гэты юбілей Вялікай Перамогі святкуецца ў няпросты час, як я ўжо казаў. Мы сталі сведкамі і ўдзельнікамі новага самага жорсткага перадзелу свету. Гэта пікавы момант чарговага вітка гісторыі, якая пачалася, на жаль, таксама 80 гадоў назад.

Атрымаўшы прытулак за акіянам, нацысцкія злачынцы ператварыліся там у «мірных абывацеляў» і «актыўных грамадзян». Увесь гэты час яны натхнялі сваіх пераймальнікаў на новую хвалю эскалацыі па лініі Захад — Усход. Вынік: яшчэ жывых гітлераўскіх катаў сёння ўшаноўваюць на дзяржаўным узроўні, мёртвых — узводзяць у святыя. Там, літаральна за сценкай ад нас — за мяжой.

Еўрапейскія краіны — удзельніцы антыгітлераўскай кааліцыі, нашы былыя саюзнікі, тыя, што з надзеяй і кветкамі чакалі прыходу Чырвонай Арміі і вызвалення ад фашызму, вядуць з намі вайну на палітычным, эканамічным, інфармацыйным франтах.

Больш за ўсіх здзіўляе Польшча, вызваляючы якую, наша армія страціла звыш паўмільёна байцоў. Яны ж не дажылі да Перамогі лічаныя месяцы, дні. Паўмільёна!

**У адказ на ваяўнічую рыторыку сучасных палітыкаў Захаду скажу коратка. І вы павінны гэта памятаць і разумець (мы гэта пакажам праз некалькі дзён): нам ёсць чым нанесці незаменны, непрымальны ўрон любому патэнцыяльнаму агрэсару.**

*(Апладысменты.)*

**Паслухайце, я ўжо шмат разоў казаў: я больш, чым любы ў гэтай зале, не хачу вайны. Я ведаю сваё месца ў гэтай вайне, не дай бог, яна здарыцца. Але вы павінны ведаць: не дай бог, хоць адзін бот ступіць праз нашу граніцу, адказ будзе без ваганняў, імгненны! Вы гэта павінны ведаць. Ваганняў ніякіх не будзе.**

*(Апладысменты.)*

А ў святочны дзень 9 Мая мы зноў паклонімся загінулым воінам каля абеліскаў і мемарыялаў, ускладзём кветкі да Вечнага агню, далучымся, вядома ж, да акцыі «Беларусь памятае».

Гэтыя традыцыі прадоўжаць нашы дзеці і ўнукі, праўнукі. Вось для чаго мы сёння сабраліся і для чаго мы ўсё гэта робім. І мы нікому не дазволім перапісаць гераічную гісторыю савецкага народа. Мы ж не адзінокія ў гэтым. Зробім усё, каб быць вартымі нашых дарагіх ветэранаў — сапраўдных патрыётаў і найлепшых сыноў нашай Айчыны.

Дарагія нашы ветэраны!

**Такое жыццё, вас засталося ўжо зусім-зусім няшмат. Вы — героі! Моцныя і нескораныя! Веліч вашага подзвігу надае нам, вашым дзецям, унукам, праўнукам, сілы для новых дасягненняў у імя міру на роднай зямлі. Найніжэйшы вам паклон.**

*(Апладысменты.)*

Дарагія сябры!

Я хачу павіншаваць усіх вас з Днём нашай Перамогі. Я хачу сказаць, што ў роднай Беларусі на святой зямлі будзе заўсёды вечная памяць загінулым. Будзе заўсёды гонар і слава народу-пераможцу.

**З юбілеем Перамогі вас, беларусы, нашых гасцей, тых, хто да нас адносіцца з дабрынёй і любоўю. Міру, дабрабыту і працвітання нашай роднай Беларусі!**

*(Апладысменты.)*

Прэзідэнт уручыў вымпелы «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» шасці гарадам Беларусі, якія з'яўляюцца прыкладам подзвігу і ўсенароднага супраціўлення, праяўленых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Кіраўнік дзяржавы перадаў вымпелы кіраўнікам мясцовых улад Кобрына, Рэчыцы, Слоніма, Сянно, Слаўгарада і Смалявіч.

**Ну вось яшчэ адна традыцыя, добрая традыцыя. Я думаю, нашы навукоўцы, спецыялісты, усе вы асаблівую ўвагу звернеце на подзвігі, не толькі якія ўжо вядомыя — Брэсцкая крэпасць, Мінск, Магілёў, Смаленск, пад Масквой, на Курскай дузе, а раней у Сталінградзе, але і вось на гэтыя невялікія гарады (хоць яны тады былі малымі). Яны перш за ўсё ваявалі і ўнеслі немалую лепту ў гэтую Перамогу. Больш за паўмільёна ў руху супраціўлення (як мы іх называем, партызанскіх атрадах) змагаліся ў Беларусі. І вось яны сёння з гэтымі ўзнагародамі стаяць — прадстаўнікі тых вялікіх народаў. Таму мы шанавалі, шануем і будзем шанаваць вялікі подзвіг нашага народа, каб ніколі больш на нашай зямлі гэта не здарылася. Ну а калі, не дай бог (здарыцца. — заўв. «Зв.»), мы ўсе ўстанем, як яны, Брэсцкай крэпасцю на шляху любога агрэсара. Шчасця вам!**

*(Апладысменты.)*








# «МЫ ШАНАВАЛІ, ШАНУЕМ І БУДЗЕМ ШАНАВАЦЬ ВЯЛІКІ ПОДЗВІГ НАШАГА НАРОДА»

## Прэзідэнт уручыў вымпелы «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» шасці гарадам Беларусі

Кожная беларуская вёска, кожны горад памятаюць і аддана захоўваюць памяць аб ваенных старонках сваёй гісторыі. Для ўвекавечання і захавання гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны» ўзнагароджваюцца і населеныя пункты нашай краіны. Да нядаўняга часу ў гэтым гераічным спісе было 36 населеных пунктаў і гарадоў, адзначаных высокай узнагародай.



**У красавіку Прэзідэнт падпісаў Указ № 144 «Аб узнагароджанні вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны», згодна з якім вымпела ўдастоены яшчэ 6 гарадоў. Гэта Кобрын, Рэчыца, Слонім, Сянно, Слаўгарад і Смалявічы.**

У гэтых населеных пунктах на ўсіх этапах вайны ў барацьбе з ворагам адзіным фронтам стаяла мясцовае партыйна-камсамольскае і патрыятычнае падполле, партызанскія фармаванні і сілы народнага апалчэння, якія ўзаемадзейнічалі з часцямі рэгулярнай Чырвонай Арміі. Прадстаўнікам гэтых гарадоў Прэзідэнт уручыў вымпелы «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ўручэнне такіх сімвалаў стала яшчэ адной добрай традыцыяй сучаснай Беларусі. Такім чынам захоўваецца памяць не толькі пра шырока вядомыя подзвігі, напрыклад, але і памяць пра ролю невялікіх гарадоў. «Яны ваявалі і ўнеслі немалую лепту ў гэту Перамогу. Больш за паўмільёна ў руху супраціўлення (як мы іх называем, партызанскіх атрадах) змагаліся ў Беларусі, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы шанавалі, шануем і будзем шанаваць вялікі подзвіг нашага народа, каб ніколі больш на нашай зямлі гэта не здарылася. Ну а калі, не дай бог, — мы ўсе ўстанем, як яны, Брэсцкай крэпасцю на шляху любога агрэсара».

# «МЫ ПАМЯТАЕМ ПОДЗВІГ СВАІХ ПРОДКАЎ І БУДЗЕМ ПЕРАДАВАЦЬ ЯГО НОВЫМ ПАКАЛЕННЯМ СВАЁЙ СЯМ'І»

Урачысты сход да 80-годдзя Вялікай Перамогі аб'яднаў усіх неабыякавых да сваёй гераічнай і трагічнай гісторыі людзей. Было відаць па настроі: для ўсіх з іх Дзень Перамогі — найважнейшае свята, якое не адняць, не падмяніць. А яшчэ яно такое блізкае кожнаму і таму, што практычна няма ніводнай беларускай сям'і, якую б не закранула ваеннае ліхалецце. Асабістымі гісторыямі, якія з'яўляюцца фундаментам іх уласнай памяці, часцінкай усенароднага подзвігу, яны падзяліліся з нашымі карэспандэнтамі.



**Анатоль ЖАРЫКАЎ, дзіця вайны, палкоўнік у адстаўцы:**

— У гады вайны я знаходзіўся ў дзіцячым доме ў Казахстане. У Беларусь вярнуўся ў 1944-м, калі вызвалілі Магілёўскую вобласць. 9 Мая — гэта святы дзень. Над галавой — мірнае неба, жывём без аглядкі. Хоць цяпер і няпростая абстаноўка, будзем спадзявацца, што ў выпадку чаго наша армія адстаіць нашу незалежнасць. Кожны год прысутнічаю на парадзе і бачу, як наша тэхніка ўдасканальваецца, узмацняецца: так што вораг нам не страшны, мы пераможам. І моладзь да гэтага заклікаем: быць сапраўднымі патрыётамі сваёй Радзімы. Разам з моладдзю арганізоўваем у школах урокі мужнасці. Заседжвацца не даюць.



**Уладзімір КАРАНІК, намеснік Прэм'ер-міністра:**

— Родныя дзядзькі маіх бацькоў былі дзеючымі ваеннаслужачымі на момант пачатку Вялікай Айчыннай вайны. На жаль, ні адзін, ні другі з фронту не вярнуліся. Трагедыя беларускага народа — загінулы кожны трэці. І заўсёды Дзень Перамогі — найвялікшае свята для нас, радасць са слязамі на вачах, як спяваецца ў вядомай песні. З аднаго боку, мы радуемся, што пакаленне пераможцаў змагло зламаць хрыбет фашызму і адстаяць права беларускага народа жыць на сваёй зямлі. З другога боку, мы разумеем, што беларускі народ заплаціў страшную цану. Мы смуткуем як па тых, хто загінуў на палях бітваў, так і па мірных жыхарах, якія былі па-зверску знішчаны акупантамі. Дзень Перамогі — фактычна аснова нашай дзяржаўнасці. Не было б гэтага свята, не было б і сучаснай, такой любімай намі Беларусі.



**Кацярына ДУЛАВА, генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі:**

— Дзень Перамогі — гэта свята-памяць. Ён павінен застацца той падзеяй, якая найважнейшая ў жыцці кожнага. А што было б, калі б не? У нашай сям'і заўсёды захоўвалася памяць аб продках, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, я выхоўвалася на ёй. Два браты майго бацькі, мае два дзядзькі, былі ўдзельнікамі вайны. Адзін з іх загінуў у Літве, другі — у фінскай вайне. Усё гэта жывое. Бацька расказваў мне, што ён назіраў, як гэта развівалася і як потым аднаўлялася жыццё. Каштоўнасць таго, што ўзнікае пасля, не параўнальная ні з чым. Я расказваю аб гэтым сваім дзецям. Бацька майго мужа — інвалід Вялікай Айчыннай вайны. Падчас абароны Ленінграда ён застаўся без рукі, але гэта не перашкодзіла яму дасягнуць пасля вайны вышынь. Андрэй Васільевіч Дулаў — заснавальнік кафедры крыміналістыкі БДУ. З такой воляй, такім характарам чалавек, які бачыў боль, пакуты. Мы імкнуліся выхоўваць у дзецях гэта тонкае разуменне, што гэта не банальныя факты гісторыі, а памяць сям'і, якая адбылася дзякуючы таму, што дзядуля быў такім, што гэта памяць той краіны, дзе ты жывеш.



**Валерый МАЛАШКА, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў:**

— У Беларусі, як і ў Расіі, няма такой сям'і, дзе б ні славіўся свой герой. Вельмі важна, што мы сёння не проста памятаем нашых герояў, а перадаём гэту памяць з пакалення ў пакаленне. Як кажа наш Прэзідэнт: калі не ведаеш, што рабіць, паглядзі ў падручнік свайго ўласнага жыцця. Адзін мой дзед павяваў літаральна тры месяцы і склаў галаву пад Ленінградам. Другі дзед у 1939 годзе пачынаў служыць у Чырвонай Арміі, скончыўшы Саратаўскае ваеннае вучылішча. На жаль, у першыя дні вайны трапіў у палон. У 1943-м уцёк і працягваў змагацца з ворагам у складзе партызанскага атрада. На шчасце, нарадзіў дзяцей і разам з бабуляй аднаўляў народную гаспадарку. Такія гісторыі вельмі важныя для маіх дзяцей, унучак, бо гэта гісторыя той краіны, у якой мы жывём. Гэта тыя ўрокі, якія мы павінны браць у тым ліку з уласнага жыцця, для таго, каб тыя жахі больш ніколі не паўтарыліся і той фашызм, які сёння падняў галаву ў Еўропе і, на жаль, у нашай роднай Украіне, быў знішчаны разам з каранямі.



**Сяргей АНДРЭЕЎ, намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама:**

— Мой дзядуля, Сцяпан Іванавіч Касьянаў, змагаўся з ворагам на гомельскай зямлі: быў камісарам партызанскага атрада «Бальшавік», удзельнічаў у шматлікіх аперацыях. Дзядуля маёй жонкі ваяваў у складзе 2-й гвардзейскай танкавай Тацінскай дывізіі, якая вызваляла Мінск. Мы памятаем подзвіг сваіх продкаў і будзем перадаваць яго новым пакаленням сваёй сям'і. Мы захоўваем узнагароды нашых дзядоў. Па традыцыі кожнае 9 Мая мы едзем на месцы пахаванняў сваіх гераічных продкаў, каб ушанаваць іх памяць. А ўвечары бяром у рукі іх узнагароды, разглядваем фотаздымкі дзядоў. Дзень Перамогі — святы дзень для нашай сям'і.



**Лілія АНАНІЧ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання:**

— Кожная беларуская сям'я мае ў сваёй хаце трагічную і гераічную старонку. Трагедыя ў нашай сям'і здарылася, калі маю бабулю спалілі немцы ў вёсцы Дунаі Лагойскага раёна. Гераічная старонка звязана з маім бацькам, які ў 17 гадоў пайшоў у партызаны. Дзень Перамогі — гэта заўсёды памяць пра сям'ю, мінулае, шкадаванне, што не ўсё распыталі ў таты. Вялікі гонар, што наша краіна так годна нясе гэту памяць. З болем успрымаю тое, што робіцца на Захадзе, дзе бандэраўцы ўдзельнічаюць у шэсцях, прысвечаных гэтай даце.

Заканчэнне на стар. 6 ►








# «МЫ ПАМЯТАЕМ ПОДЗВІГ СВАІХ ПРОДКАЎ І БУДЗЕМ ПЕРАДАВАЦЬ ЯГО НОВЫМ ПАКАЛЕННЯМ СВАЁЙ СЯМ'І»

Можна толькі ўявіць, як было б балюча тым, хто з гэтай Перамогай прыйшоў у Берлін. Але нашы продкі ведаюць: мы — годныя нашчадкі. Яны бачаць, што краіна, якую яны пакінулі ўжо, умацавалася за гады незалежнасці пад кіраўніцтвам Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі. У мяне дагэтуль захоўваюцца трохвугольнікі-паштоўкі, якія, калі бацька быў жывы, Прэзідэнт дасылаў на кожныя Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці. Гэта духоўны скарб нашай сям'і.



**Андрэй ШВЕД, генеральны пракурор:**

— Сёння мы як ніколі павінны з'яднацца, як сказаў Прэзідэнт, сціснуўшы зубы, зрабіць усё магчымае для таго, каб памяць аб тых страшных падзеях, уроках Другой сусветнай вайны перадавалася наступным пакаленням. Варта крыху забыць — усё паўторыцца зноў. Вайна закранула і маю сям'ю. Дзядуля маёй жонкі гераічна ваяваў у партызанах, а затым — у дзеючай арміі, мае баявыя ўзнагароды. Мой родны дзядуля прайшоў такі ж шлях: партызаніў, затым ваяваў да 1948 года на франтах Вялікай Айчыннай вайны, затым у Прыбалтыцы. Таму, вядома, мы ганарымся і памятаем, але самае галоўнае, што нашы дзеці і ўнукі павінны не толькі ведаць іх у твар, а і ведаць пра іх подзвіг.



**Руслан ЧАРНЕЦКІ, міністр культуры:**

— Абодва мае дзяды загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. А таму мае і маці, і бацька выраслі сіротамі. Для мяне, маёй сям'і, як і для любога беларуса, гэта асабістая трагедыя. Самае жудаснае, што з усіх ахвяр той вайны (кожнага трэцяга беларуса, трох мільёнаў чалавек) два мільёны — гэта толькі мірнае насельніцтва. Мае дзядулі — у ліку вялікай колькасці людзей, якія зрабілі ўсё для таго, каб у нас было мірнае неба над галавой. І мы проста абавязаны захоўваць памяць аб тых падзеях, перадаваць яе сваім дзецям, унукам.



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, доктар эканамічных навук:**

— Вялікая Айчынная вайна прынесла вельмі вялікія страты: чалавечыя, матэрыяльныя. І калі мы кажам аб тым, што гэта памяць вечная, гэта не толькі даніна павагі таму, што было зроблена ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Гэта элемент фарміравання патрыятызму ў нашай краіне. Чалавечая памяць так уладкавана, што забываюцца пэўныя даты, прозвішчы. Таму мы павінны быць жывым прыкладам, як трэба захоўваць памяць, мацаваць адзінства нацыі, гарнарыцца тым, што мы выстаялі ў цяжкі час выпрабаванняў. Цяпер неабходна ўсё зрабіць для таго, каб новыя пакаленні не страцілі тыя каштоўнасці, якія былі заваяваны цаной многіх-многіх жыццяў. Мой бацька прайшоў Вялікую Айчынную вайну. Нядаўна, калі быў у Музеі Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі, знайшоў яго ў спісах, і мне было вельмі прыемна, што ўвекавечаны імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія прайшлі — хто менш, хто больш — гэтыя 1400 з лішнім ваенных дзён.



**Віктар ПЛЕСКАЧ, член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў:**

— У маёй жонкі ваявалі і цётка, і дзядзька, які быў ваенным лётчыкам. Нягледзячы на чатыры раненні, прайшоў усю вайну. Пасля Перамогі жыў у Ваўкавыску і вельмі радаваўся, што мы жывём у такой краіне, як Савецкі Саюз. Тыя людзі былі нешматслоўныя, але па міміцы твару, скупой слязе, якую можна было ўбачыць у гэтыя святыя дні, было зразумела, якой дарагой цаной далася Перамога.



**Таццяна ПАПОК, настаўніца па класе вакалу Клецкай дзіцячай школы мастацтваў:**

— Мае два дзядулі ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Адзін з іх загінуў, другі быў паранены, дачакаўся Перамогі і пайшоў з жыцця практычна ў 90 гадоў. 9 Мая для яго было асаблівым днём. Ён апранаў свой пінжак, увешаны ўзнагародамі, і ўдзельнічаў у шматлікіх мітынгах, іншых мерапрыемствах. Я часта пыталася ў дзеда Рыгора пра вайну. Ён расказваў, але, вядома, пра жахі, якія давялося перажыць, маўчаў. Больш расказваў пра паўсядзённыя рэчы: на вайне і песні спявалі. Дзень Перамогі — знакавая падзея для кожнага беларуса. Мы павінны даносіць важнасць гэтага дня да нашай моладзі. Днямі мы з маёй вучаніцай спявалі песню «Званы Хатыні», яна так праніклася гэтым творам, што расплакалася. Гэта нармальная рэакцыя. Я ёй растлумачыла, чаму важна ўспамінаць пра тыя падзеі.



**Мікалай БАРЫСЕНКА, кіраўнік грамадскага аб'яднання «Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру»:**

— У майго дзядулі было сямёра родных братоў. Пяцёра з іх не вярнуліся з фронту. Месца гібелі толькі аднаго з іх удалося ўстанавіць. Сам дзядуля дапамагаў партызанам-«грышынцам» (атрада імя Грышына. — **«Зв.»**), немцы яго падстрэлілі — ён страціў нагу. Я бачыў, як бабуля, мама спрабавалі знайсці сваіх родных, што згінулі на вайне, але беспаспяхова — ніякіх слядоў. Магчыма, мне гэта перадалося, таму я стаў займацца пошукавай дзейнасцю. Напэўна, адбілася і тое, што і вырас я ў баявым — Чавускім — раёне. Раней свята Перамогі мы не асаблівa святкавалі, трымалі яго на адлегласці. Ведалі, колькі мільёнаў людзей знікла без вестак. Толькі ў Беларусі, я ўжо не кажу пра маштаб Савецкага Саюза. Мы лічылі гэты парадны пераможны звон не зусім дарэчным. Не да святкавання было: трэба было больш салдат знайсці, «раскруціць» невядомыя старонкі гісторыі. Цяпер мы да гэтага адносімся па-іншаму, паглядзеўшы на аб'яднаную Еўропу, што яны вытвараюць, на Штаты. Цяпер для нас Перамога — гэта найперш не даць сказіць яе вынікі, памяць аб тых падзеях. Мы — пакаленні, якія выраслі на гэтай вайне, і калі мы апусцім рукі — грош нам цана.



**Таццяна ІМШАНЕЦКАЯ, загадчыца кафедры афтальмалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:**

— Дзень Перамогі — святы дзень для маёй сям'і. Мой бацька, Аляксандр Аляксандравіч Імшанецкі, закончыў Першы Маскоўскі медыцынскі ўніверсітэт у 1943 годзе. Падчас вучобы працаваў на хуткай дапамозе ў Маскве, затым яго разам з аднакурснікамі адправілі пад Сталінград. Шкада, няшмат хлопцаў з выпуску дажылі да Перамогі. Бацьку пашчасціла: ён выжыў і ўсё жыццё быў ваенным урачом. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені. Брат маёй мамы загінуў пад Ленінградам. Нашы бацькі былі вельмі сціплыя, таму асабліва не расказвалі пра вайну: сваімі аповедамі імкнуліся не засмучаць блізкіх, берагчы мір, які заваявалі. 9 Мая заўсёды было святам, якое адзначала ўся сям'я, калі згадвалі ўсіх, хто не дажыў да гэтага святога дня. Гэта было вельмі сціплае і цярплівае пакаленне, якое дало зарад на ўсё жыццё.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА і Лізаветы ГОЛАД.**

***(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5)***


## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА (далее – Аукцион) по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в **д. Бабий Лес, д. Буда** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

Аукцион состоится **13 июня 2025 г. в 10.00** в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.

*Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет.*

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Бабий Лес** | 624881700601000112 | 0,1499 га | (1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 7 000,00 |
| 2 | **д. Буда** | 624881702601000012 | 0,1581 га | | 10 000,00 |

Извещение о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу – **https://au.nca.by,** Смолевичского райисполкома – **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023532

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества общества с ограниченной ответственностью «БешЛесИнвест»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1391 | Рохли, инв. № 00000004 и инв. № 00000005 | 2 400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 1392 | Вилочный погрузчик Still DFG 1.6/7031 2006 г. в., инв. № 00000014 | 21 000,00 | 2 100,00 | 1 050,00 |
| 1393 | Станок для разводки ленточных пил RWM 2016 г. в., инв. № 00000019 | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 1394 | Станок для заточки дисковых пил 2016 года выпуска, SOPW-150 для деревообрабатывающего оборудования, инв. № 00000023 | 2 400,00 | 240,00 | 120,00 |

В отношении лотов проводятся первые повторные торги.
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 02.11.2024

**Местонахождение лотов:** Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1Д, корп. 2

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **23 мая 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 7 мая 2025 года до 16.00 21 мая 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «БешЛесИнвест», проводимых 23.05.2025.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1392 – 7 %, по лотам №№ 1391, 1393, 1394 – 9 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов с понедельника по пятницу по предварительному согласованию, **тел. +375447513892, e-mail: schl6405@mail.ru** (ликвидатор).

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «БешЛесИнвест» в лице ликвидатора – ООО «С чистого листа», тел. +375447513892 (Республика Беларусь, 211361, Витебская область, Бешенковичский район, г. п. Бешенковичи, ул. Черняховского, д. 1В, УНП 391016510)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. +375 (29) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ПРЫКЛАД ЭФЕКТЫЎНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

## У чым перспектыва развіцця гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Азербайджана?

Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН у час сустрэчы з прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам АЛІЕВЫМ, якая адбылася ўчора, расказаў, у чым перспектыва развіцця гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Азербайджана.



Прэм'ер-міністр Беларусі паведаміў, што ён першы раз у Баку і горад яго ўразіў — пабач з ультрасучаснымі будынкамі знаходзяцца старажытныя дамы, а таксама ўсё ўвіта зеленню.

— Адчуваецца ўважлівае стаўленне да развіцця горада, — канстатаваў ён і дадаў, што першы дзень афіцыйнага візіту беларускай дэлегацыі 5 мая ў Азербайджан выдаўся плённым.

Прэм'ер-міністр назваў сумесныя вытворчасці ключавым кірункам развіцця супрацоўніцтва дзвюх краін.

У прыватнасці, у першы дзень афіцыйнага візіту Аляксандр Турчын наведаў азербайджанскае прадпрыемства, дзе рэалізаваны праект па зборцы беларускіх ліфтаў.

— Лакалізацыя ў іх складае 65 % ужо толькі на пачатковай стадыі. Гэта яскравы прыклад сумеснага прадпрыемства, якое зрабілі беларуская і азербайджанскія партнёры, — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

Акрамя таго, Аляксандр Турчын адзначыў вялікі патэнцыял Гянджынскага аўтамабільнага завода як базы, на якой можна збіраць беларускую пажарную, камунальную тэхніку, трактары.

— Менавіта ў сумесных вытворчасцях бачу я вялікую перспектыву супрацоўніцтва Беларусі і Азербайджана, а таксама ёсць шмат новых кірункаў, па якіх мы маглі б працаваць, — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў у час сустрэчы з Прэм'ер-міністрам Беларусі Аляксандрам Турчыным назваў асноўныя кірункі партнёрства дзвюх краін.

— Характар нашых адносін дружалюбны, братэрскі. Мы нацэлены на супрацоўніцтва і добры вынік, — падкрэсліў ён.

Кіраўнік Азербайджана звярнуў увагу на тое, што адносіны дзвюх краін грунтуюцца на падтрымцы і актыўным узаемадзеянні і выказаў спадзяванне, што ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве будуць дасягнуты такія ж поспехі, як і ў палітычнай сферы.

— Мы ўзнялі нашы адносіны на высокі ўзровень, таму цяпер адзін з нашых галоўных прыярытэтаў — нарошчванне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У нас ёсць добры вопыт стварэння сумесных вытворчасцяў, думаю, што гэты вопыт павінен быць прадоўжаны, — упэўнены ён.

Таксама вялікі патэнцыял Азербайджан бачыць у супрацоўніцтве ў сельскай гаспадарцы, што не раз абмяркоўвалася на высокім узроўні.

Акрамя таго, Ільхам Аліеў назваў перспектыўным супрацоўніцтва краін у ваенна-тэхнічнай сферы і многіх іншых кірунках.

— Мы нацэлены на ўмацаванне ўзаемадзеяння, — звярнуўся ён да Аляксандра Турчына. — Ваш візіт і ўдзел у розных мерапрыемствах — важны крок ва ўмацаванні ўзаемадзеяння дзвюх краін.

Пасля сустрэчы ўрадавая дэлегацыя накіравалася ў гарады Фізулі і Агдам. У першым пункце прызначэння спецпрадстаўнік прэзідэнта Азербайджана ў Агдамскім, Фізулінскім і Хаджавендскім раёнах Эмін Гусейнаў прэзентаваў Аляксандру Турчыну новае аблічча горада Фізулі.

Таксама Прэм'ер-міністр азнаёміўся з магчымасцямі для бізнесу і эканомікі Агдамскага прампарка.

Дарэчы, рэзідэнты парка маюць шматлікія ільготы, сярод якіх гатовая інфраструктура за кошт дзяржавы; вызваленне ад падаткаў на маёмасць, зямлю і даход на 10 гадоў; няма ПДВ і мытных пошлін пры ўвозе абсталявання.

Прадукцыя прампарка выкарыстоўваецца на ўнутраным рынку. Ідуць перамовы аб пастаўках прадукцыі на экспарт.

У Агдамскім раёне Прэм'ер-міністру прадставілі праект будучага аграгарадка ў раёне вёскі Гызыл Кенгерлі. На думку, кіраўніка беларускага ўрада цалкам рэальна тут пабудаваць малочна таварны комплекс і цяплічную гаспадарку.

Дарэчы, зараз Азербайджан актыўна займаецца аднаўленнем гэтых няпростых тэрыторый. Для таго каб удыхнуць жыццё ў раён, патрабуюцца не толькі вялікія грошы, але і рукі і тэхналогіі. З гэтым наша краіна гатовая дапамагчы.

**Па матэрыялах БелТА, фота БелТА.**

### Кампетэнтна

## Планавая і сістэмная работа

### У найбліжэйшы час у Беларусі з'явяцца сумесныя прадукты з ваенна-прамысловым корпусам Азербайджана

Аб гэтым журналістам расказаў **старшыня Дзяржкамваенпрама Дзмітрый ПАНТУС.**

Ён адзначыў, што ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі з Азербайджанам мае стратэгічны характар і славіцца сваёй даўняй гісторыяй, таму працягваецца планавая і сістэмная работа.

Паводле слоў старшыні Дзяржкамваенпрама, цяпер бакі абмяркоўваюць сумесныя праекты па арганізацыі вытворчасці прадукцыі ваеннага прызначэння з беларускімі напрацоўкамі, у тым ліку на тэрыторыі Азербайджана.

— Гэта работа прадаўжаецца і ў найбліжэйшы час у нас з'явяцца сумесныя прадукты з ваенна-прамысловым корпусам Азербайджана ў прыватнасці, — падкрэсліў ён.

### Лічбы і факты

## Сабралі амаль 15 тысяч трактароў

### Як Гянджынскі аўтазавод супрацоўнічае з беларускімі прамысловымі гігантамі

**Старшыня наглядальнага савета Гянджынскага аўтамабільнага завода Ханлар ФЕЦІЕЎ** расказаў журналістам аб тым, як аўтазавод супрацоўнічае з беларускімі прамысловымі гігантамі падчас наведвання аднаго з аб'ектаў у Баку ўрадавай дэлегацыяй Беларусі на чале з Прэм'ер-міністрам Аляксандрам Турчыным.

З 2007 года Гянджынскі аўтамабільны завод збірае трактары BELARUS.

— Мы крыху недацягнулі пакуль што да **15** тысяч адзінак. Спадзяюся, гэта адбудзецца сёлета. Таксама мы сабралі каля **3,5** тысячы машын МАЗ, — адзначыў Ханлар Феціеў.

Ён нагадаў, што зборка трактароў у краіне пачалася пасля візіту Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева ў Беларусь, які даў адпаведнае даручэнне.

— Гэта ўсё вынік таго, што нашы прэзідэнты ў свой час дамовіліся, а таксама пастаянна падтрымліваюць гэтыя ініцыятывы, — упэўнены старшыня наглядальнага савета. — Сёння Беларусь і Азербайджан — дружалюбныя, брацкія краіны.

Па выніках перагавораў прэм'ер-міністраў Беларусі і Азербайджана Аляксандра Турчына і Алі Асадава 5 мая Гянджынскім аўтамабільным заводам быў падпісаны мемарандум з Мінскім трактарным заводам аб развіцці супрацоўніцтва па пастаўках трактарнай тэхнікі, а таксама кантракт з Мінскім аўтамабільным заводам на пастаўку машынакамплектаў камунальных машын.

Ханлар Феціеў расказаў, што сёлета завод плануе сабраць да **1** тысячы трактароў.

— Летась было **780**. Таксама пастаянна працуем і з Мінскім аўтазаводам, — адзначыў ён.

# СВЯТЛО ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

## У БДУ прайшоў Міжнародны маладзёжны форум «Святло Вялікай Перамогі»

З самага ранку на пляцоўцы каля мемарыяла «Стэла памяці» ў студэнцкім гарадку БДУ сабраліся галоўныя дзеючыя асобы мерапрыемства — больш за 200 студэнтаў з 12 беларускіх і 10 расійскіх ВНУ.

Адкрываючы мітынг, **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір КАРАНІК** адзначыў:

— Напярэдадні такога значнага для нашага народа свята — 80-годдзя Вялікай Перамогі — мы ўспамінаем гады ваеннага ліхалецця і разумеем, што гэта сапраўды радасць са слязамі на вачах. Так, наш народ выстаяў, перамог, але страціў кожнага трэцяга, мы да гэтага часу адкрываем страшныя факты генацыду. І важна захаваць памяць як даніну павагі пакаленню пераможцаў, якое зламала хрыбет фашызму. Гэта важна яшчэ і таму, што той, хто не памятае ўрокаў мінулага, асуджаны на яго паўтарэнне. Мы павінны зрабіць усё, каб наш народ, колькі б часу ні прайшло, ніколі больш не перажываў жахаў вайны, каб ніколі больш вайна не ступала на нашу зямлю.

**Рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ** сказаў, што напярэдадні Дня Перамогі кожная асветніцкая і духоўна-маральная ініцыятыва напоўнена многімі сімваламі і значэннямі.

— Вельмі важна, каб удзельнікі форуму змаглі вылучыць свае сэнсы, знайсці адказы на свае пытанні і напоўніліся пачуццём адзінства. У далейшым гэта дазволіць захаваць праўду аб ваенным мінулым і перадаць наступным пакаленням рэальную гісторыю з яе ключавымі героямі і іх подзвігамі, — дэталізаваў рэктар БДУ.

— У БДУ, на жаль, засталося толькі пяць такіх герояў, — працягнуў кіраўнік ВНУ. — Адзін з іх і дагэтуль актыўна ўдзельнічае ва ўсіх традыцыйных памятных падзеях. Гэта Фёдар Сяргеевіч Фешчанка. Дарэчы, сёлета ён адзначыць свой 100-гадовы юбілей.

Пасля мітынгу пачаліся мерапрыемствы форуму, а адным з галоўных стаў «Адкрыты мікрафон», дзе студэнты размаўлялі з Уладзімірам Каранікам аб гістарычнай памяці і праўдзе пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, іх захаванні і перадачы маладому пакаленню.

Былі і вельмі сур'ёзныя пытанні, якія датычыліся нацысцкай палітыкі на тэрыторыі Беларусі.

— Метады абсалютна бесчалавечныя, — адказаў намеснік прэм'ер-міністра. — І гэта мала дзе афішыравалася. Але ўсё ж удалося знайсці ў архівах генеральны план «Ост», які меў на ўвазе, што на тэрыторыі цяперашняй Беларусі павінна застацца толькі 25 % насельніцтва, 75 % падлягала знішчэнню. І чым глыбей праводзяцца даследаванні, тым больш жудасныя факты адкрываюцца.

У рамках форуму таксама адбыліся лекцыйныя дыскурсы, гутаркі і калектыўныя абмеркаванні. Прайшла панэльная дыскусія «Змена эпох: візуалізацыя гістарычнай памяці ў XXI стагоддзі».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Вороновская сельхозтехника», Гродненская обл., Вороновский р-н, д. Бояры. УНП 500007686 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |
| **Предмет электронных торгов (имущество реализуется одним лотом).** Местоположение – **Гродненская обл., Вороновский р-н, Заболотский с/с, 2** | |
| Производственная база в составе: **здание столяр. цеха** (454,8 кв. м, 421/С-1876), **здание мастерских** (1292,3 кв. м, 421/С-1879, составные части – заборы, ворота, проезжая часть, участки линий электропередачи), **здание пункта технич. ухода** (412,4 кв. м, 421/С-1882), **здание проходной** (24,9 кв. м, 421/С-1881), **здание конторы** (233,7 кв. м, 421/С-1877), **склад газ. баллонов** (23 кв. м, 421/С-3185), **навес** (501,4 кв. м, 421/С-3184). ***Сведения о земельных участках:*** предоставлены продавцу на праве постоянного пользования пл. **5,7861 га** для размещения объектов промышленности (ограничения (обременения) – охран. зоны линий электропередачи пл. 0,5000 га) и **0,0057 га** для обслуживания склада газ. баллонов | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 49 390,03 бел. руб.** (снижена на 50 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 6 % от цены продажи предмета торгов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.04.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 22.05.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 21.05.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **ГУ «Дворец культуры имени М. Горького»**
(арендодатель) проводит открытый аукцион

**по продаже права заключения договора аренды части капитального строения с инв. № 610/С-13856 (нежилого помещения, общей площадью 71,7 кв. м), расположенного на первом этаже Дворца культуры им. М. Горького по адресу: Минская область, г. Борисов, пр-т Революции, 49, для размещения объекта общественного питания.**

Срок заключения договора аренды – **3 года.**

Размер ежемесячной арендной платы – **53,78 базовых арендных величин (или 1009,45 бел. руб.)*** *(без учета коэффициента для отдельных видов деятельности)*.

**Начальная цена предмета торгов – 336,45 бел. руб.**

Аукцион состоится **27.05.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **26.05.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**
**Телефон для осмотра (8029) 612-96-61.**
**Сайт в сети интернет: www.rlt.by.**
Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах:
**au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by**

УНП 600078786

**Плещеницкий сельский исполнительный комитет**
в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»
РАЗЫСКИВАЕТ СОБСТВЕННИКОВ, НАСЛЕДНИКОВ И ЛИЦ,
имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **д. Прилепцы, ул. Первомайская, д. 8** Плещеницкого сельсовета Логойского района Минской области (правообладатель – Козловская Валентина Викторовна).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В. И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-1-65.

УНП 600181684

Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Лимаж» УНП 191331901 сообщает об утрате свидетельства о государственной регистрации юридического лица.


ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ВЫГАДНА І ЛЮДЗЯМ, І ПРАДПРЫЕМСТВАМ»

## Пад кіраўніцтвам Старшыні Савета Рэспублікі адбылося пасяджэнне Экспертнага савета

Галоўнай тэмай пасяджэння стала паўторнае абмеркаванне праекта закона «Аб прызнанні кваліфікацыі». Ён датычыцца кіраўнікоў прадпрыемстваў, работадаўцаў і работнікаў.



Фота БелТА.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** патлумачыла, чаму законапраект вынесены на паўторнае абмеркаванне: «Мы ўжо разглядалі гэта пытанне, але закон неаднаначна ўспрымаецца. Таму сёння мы запрасілі ўсіх членаў Савета Рэспублікі, якія ўзначальваюць прадпрыемствы, каб абмеркаваць гэты законапраект яшчэ раз, з прыцягненнем шырокага кола спецыялістаў».

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля ПАЎЛЮЧЭНКА** расказала, што пры першым разглядзе законапраекта на Экспертным савеце было шмат разважанняў, асцярог, тых пытанняў, якія трэба было яшчэ паглядзець, урэгуляваць і прапрацаваць непасрэдна з экспертамі: «Гэтыя пытанні прапрацаваны, створана рабочая група ў Палаце прадстаўнікоў. Адначасова законапраект прапрацоўваўся з прадпрыемствамі, установамі адукацыі».

Па выніках гэтых абмеркаванняў і ўзгадненняў законапраект быў істотна дапрацаваны, стаў больш кампактным і простым для ўспрымання».

Калі казаць пра сутнасць законапраекта, то ён мае на ўвазе даванне пашыраных магчымасцяў працаўладкавання па рабочых прафесіях. «Ёсць людзі, якія ў тым ліку па стане здароўя не могуць асвоіць усе працоўныя функцыі прафесіі, але могуць асвоіць гэтую прафесію часткова. Напрыклад, людзі з інваліднасцю, людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Яны маюць магчымасць асвоіць асобныя навыкі.

Такім чынам, атрыманне сертыфіката аб праходжанні кваліфікацыі на асобныя віды работ дазволіць такім грамадзянам пашырыць магчымасці працаўладкавання», — патлумачыла міністр.

Яшчэ адна катэгорыя асоб, якая можа скарыстацца нормамі гэтага законапраекта, — працоўныя мігранты. Паводле слоў Наталлі Паўлючэнка, беларускі рынак працы адкрыты для працоўнай міграцыі, да нас прыязджаюць рабочыя з розных краін свету: «З чым мы сутыкаемся? Якая існуе праблема? Такі чалавек сутыкаецца з паніжанай аплатай працы, паколькі пры працаўладкаванні на рабочую прафесію ў яго адсутнічаюць дакументы аб адукацыі. Тады ён пачынае працаваць у статусе вучня, хоць у прынцыпе валодае пэўнымі навыкамі, можа выконваць адпаведныя аб'ёмы работ, але не можа пацвердзіць сваю кваліфікацыю».

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах генеральны дырэктар ААТ «Гомсельмаш» Аляксандр НОВІКАЎ** адзначыў важнасць законапраекта, што разглядаецца: «У жыцці здараюцца такія сітуацыі, калі чалавек 4-6 гадоў працуе па той ці іншай спецыяльнасці, мае пэўную кваліфікацыю і разрад, але з прычыны розных абставін не мае пацвярджальнага дакумента. І гэты законапраект дазваляе максімальна хутка атрымаць такі дакумент, каб чалавек далей па сваёй кваліфікацыі мог працягнуць работу на тым ці іншым прадпрыемстве. Сёння праважнасць гэтага закона гаворыць не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Ён таксама дасць магчымасць папоўніць дэфіцыт рабочых кадраў».

Сенатар падкрэсліў, што законапраект дазваляе чалавеку ў пэўнай акрэдытаванай арганізацыі атрымаць кваліфікацыю, здаўшы экзамен, пацвердзіўшы тым самым свой разрад: «Здаўшы экзамен, атрымаўшы сертыфікат дзяржаўнага ўзору, ён ужо можа ў адпаведнасці з атрыманым разрадам працаўладкавацца на тое ці іншае прадпрыемства. А гэта выгадна і людзям, і прадпрыемствам».

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ**, названы законапраект быў істотна дапрацаваны, падрыхтаваны да першага чытання рэдакцыі законапраекта. Сенатар спыніўся на заўвагах, якія паступілі ад членаў Экспертнага савета. «Па выніках паўторнага разгляду праект закона ў цэлым падтрыманы. Разам з тым у дачыненні да асобных палажэнняў выказаны заўвагі і прапановы.

Па-першае, прапаноўваецца распаўсюдзіць норму праекта закона па прызнанні кваліфікацыі не толькі ў дачыненні да прафесій рабочых, але і да пасад служачых, магчыма, па абмежаваным пераліку.

Па-другое, неабходна стандартызаваць экзаменацыйную праграму па прызнанні кваліфікацыі ў мэтах аднастайнасці аб'ектыўнай ацэнкі пры праводзенні практычных выпрабаванняў па адной і той жа кваліфікацыі.

Па-трэцяе, неабходна вызначыць у праекце закона паняцце «кваліфікацыя», паколькі ў заканадаўстве адсутнічае адзіны падыход да згаданага тэрміна, а існуючае вызначэнне карэктна ўжываць для мэт закона, які разглядаецца.

Па-чацвёртае, неабходна вырашыць пытанне аб зніжэнні ўзросту асоб, якія допускаюцца да працэдуры прызнання кваліфікацыі, з 18 да 16 гадоў», — падагульніў старшыня Пастаяннай камісіі.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# НАША СЛАВА, НАША ПАМЯЦЬ,

## ПАРАД З ПАВЕТРАНЫМ ЭШАЛОНАМ І ЎДЗЕЛАМ КРАІН-СУСЕДАК

Як праінфармаваў **намеснік міністра абароны Аляксандр НАВУМЕНКА**, падчас ваеннага парада ў складзе паветранага эшалона над сталіцай пройдуць 39 паветраных суднаў — 12 верталётаў і 27 самалётаў. З іх 35 адзінак прадстаўляюць Міністэрства абароны Беларусі, яшчэ чатыры адзінкі авіяцыйнай тэхнікі — Расію. Суседнюю краіну, дарэчы, прадставіць авіяцыйная група вышэйшага пілатажу «Рускія віцязі» на самалётах Су-30СМ. У падрыхтоўцы паветранага эшалона задзейнічана 48 паветраных суднаў, у тым ліку 9 запасных.

У складзе пешай калоны возьмуць удзел 33 парадныя разлікі, з іх 30 прадстаўляюць сілавыя структуры і ведамствы Беларусі і тры — замежныя дзяржавы. Гэта кадэты Ніжагародскага кадэцкага корпуса Прыволжскай федэральнай акругі імя генерала арміі В. Ф. Маргелава, курсанты Міхайлаўскай ваеннай артылерыйскай акадэміі (Санкт-Пецярбург) і ганаровая варта Народна-вызваленчай арміі Кітая. Акрамя таго, удзел возьмуць 5 знамённых груп ад Азербайджанскай Рэспублікі, Рэспублікі Казахстан, Кыргызскай Рэспублікі, Рэспублікі Таджыкістан і Рэспублікі Узбекістан. Усяго ў складзе пешай калоны задзейнічаны 4832 чалавекі. Яшчэ 431 прыцягнуты ў якасці запасных. У механізаванай калоне будуць удзельнічаць 26 парадных разлікаў з 275 адзінкамі тэхнікі, яшчэ 60 — запасныя.

Аляксандр Навуменка падкрэсліў, што асаблівасцю парада ў гэтым годзе з'яўляецца павелічэнне яго гістарычнай часткі.

— Мы ўбачым кавалерыстаў, тачанку з кулямётам, дадаліся парадныя разлікі афіцэраў з вінтоўкамі і баявымі сцягамі-рэліквіямі воінскіх часцей, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Таксама пройдзе зводны парадны разлік інжынераў з сабакамі, медыцынскіх работнікаў і рэгуліроўшчыкаў. Механізаваную калону ўзначаляць легендарныя танкі Т-34, пройдуць матацыклы, «Кацюша», аўтамабілі з пражэктарам і зенітнымі ўстаноўкамі, — расказаў ён.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ВЕКАПОМНАЕ

# ПАМЯЦЬ АБ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОЗЕ — АРЫЕНЦІР І МАРАЛЬНАЯ АСНОВА

## Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Вялікая Перамога ў імя міру і стваральнай працы» адбылася ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі


Фота БелТА.

У форуме, прымеркаваным да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, узялі ўдзел прадстаўнікі не толькі айчыннай навуковай і экспертнай супольнасці, але і вучоныя-гісторыкі з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Узбекістана. Да размовы аб захаванні гістарычнай праўды і памяці далучыліся музейшчыкі, архівісты, бібліятэкары, настаўнікі. Важна, што неаспрэчныя факты аб Вялікай Айчыннай вайне з першых вуснаў маглі пачуць школьнікі.

Падчас канферэнцыі былі зачытаны прывітальныя адрасы ее ўдзельнікам ад **Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандра ТУРЧЫНА** і **кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя КРУТОГА**.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў канферэнцыі, **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** адзначыў, што форум з'яўляецца данінай памяці стойкасці, мужнасці і самаахвярнасці савецкіх людзей, якія вынеслі на сваіх плячах усе нягоды Вялікай Айчыннай вайны і здабылі 80 гадоў таму Вялікую Перамогу.

Па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, для беларусаў памяць аб гэтым свяшчэнным подзвігу — у генах. «Гэта частка нашай нацыянальнай ідэі, часцінка сямейнай біяграфіі кожнага з нашчадкаў тых трох мільёнаў беларусаў, якія загінулі на франтах або былі па-зверску закатаваны, спалены жывцом нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі, — удакладніў ён. — Праходзяць гады, дзесяцігоддзі, прыходзяць новыя пакаленні. І камусьці на Захадзе, перш за ўсё тым, хто апанаваны рэваншысцкімі настроямі, хацелася б, каб мы забыліся пра Перамогу, пра тыя злачынствы, якія рабіліся на нашай зямлі, пра тую пагрозу, якую нясе свету ідэалогія нацызму. Не дапусціць гэтага — наш з вамі прамы абавязак!»

Ігар Сергяенка акцэнтаваў увагу на тым, што беларусы зробяць усё для таго, каб памяць аб Вялікай Перамозе, праўда аб генацыдзе беларускага народа заставаліся часткай генетычнага коду нацыі, народнага адзінства і згуртаванасці. «Сёння супраць нас разгорнута шырокая інфармацыйная вайна, перш за ўсё за розумы моладзі, як папярэдняя фаза вайны гарачай, — канстатаваў спікер. — Перад гісторыкамі, грамадазнаўцамі, журналістамі, сродкамі масавай інфармацыі стаяць задачы актыўнага супрацьдзеяння спробам фальсіфікацыі гістарычнага мінулага, данясення да кожнага жыхара тых сэнсаў і каштоўнасцяў, за якія змагаліся нашы бацькі і дзяды ў Другой сусветнай вайне».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў агучыў кірунікі дзейнасці, якія дазволяць выканаць гэту работу максімальна эфектыўна і адрасна. «Па-першае, беларускімі гісторыкамі вядзецца вялікая работа па даследаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, — канкрэтызаваў Ігар Сергяенка. — Але важна зрабіць так (і гэта работа ўжо вядзецца), каб вынікі даследаванняў не абмяжоўваліся акадэмічнай супольнасцю, а ішлі ў народ, праламляліся скрозь прызму асабістых гісторый канкрэтных сем'яў герояў і станавіліся прадметам гонару жыхароў канкрэтных раёнаў, населеных пунктаў і краіны ў цэлым».

Па-другое, як перакананы спікер, маладое пакаленне павінна ведаць суровую рэальнасць, у якой жылі іх родныя і блізкія ў гады акупацыі, а таксама канчатковыя мэты гітлераўцаў: фізічнае знішчэнне «непаўнавартаснай славянскай расы».

Па-трэцяе, Ігар Сергяенка адзначыў, што Вялікая Айчынная вайна дала нам найважнейшы ўрок: толькі разам, плячо ў плячо, цяжка і ўпарта працуючы, можна пераадолець беды. «У сённяшнім нестабільным свеце памяць аб Вялікай Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне служыць для краін, якія прытрымліваюцца канструктыўнага міралюбівага парадку дня, своеасаблівым арыенцірам і маральнай асновай стварэння новага светаўладкавання, заснаванага на прынцыпах роўнасці, даверу і ўзаемнай павагі, — падкрэсліў ён.

Як адзначыў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНІЯМІН**, мільёны людзей, абараняючы Радзіму, праявілі найвышэйшую любоў да свайго народа, сваёй зямлі. «Вера ў Бога, надзея на лепшую будучыню, любоў да бліжніх сталі той духоўнай сілай, якая дапамагала пераадольваць самыя суровыя выпрабаванні, — звярнуў увагу Уладыка. — Ужо цяпер, праз дзесяцігоддзі, вучоныя здзіўляюцца, як у такіх неверагодных умовах можна было выжыць. Пры гэтым застацца чалавекам: не азлобіцца, захаваць высакароднасць, узвышанасць і маральную перавагу над тымі, хто прыйшоў захопнікамі на нашу зямлю».

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі падкрэсліў, што сёння нашчадкі пераможцаў заклікаціны не толькі захоўваць памяць аб тых гераічных гадах, а і асэнсоўваць урокі таго перыяду, каб супрацьстаяць любым спробам скажэння гістарычнай праўды і раз'яднання народаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

# НАШ ГОНАР

## НА ПЛОШЧАХ, У ПАРКАХ І НАВАТ У ГАНДЛЁВЫХ ЦЭНТРАХ

Аднак роля ваенных у свяце не абмяжуецца парадам. Шэраг мерапрыемстваў з іх удзелам пройдзе па ўсёй краіне.

— Работа ваенна-тэматычных пляцовак у святочныя дні ўжо стала добрай традыцыяй. Беларусы, асабліва самыя юныя і маленькія, з нецярпеннем чакаюць сустрэчы з ваеннаслужачымі. Жыхары і госці сталіцы змогуць азнаёміцца з сучасным узбраеннем і спецыяльнай і ваеннай тэхнікай, узорамі вайсковай формы адзення і экіпіроўкі, атрымаць асалоду ад выступлення ваенных аркестраў і армейскіх творчых калектываў. Традыцыйна вайскоўцы прыгатуюць і пачастуюць гасцей свята салдацкай кашай. У святочных лакацыях будуць працаваць фотазоны, пункты прафарыентацыі, выстаўкі музейных экспанатаў і многае іншае, — расказаў **начальнік аддзела ўпраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Аляксандр КІСЕЛЬ.**

У Мінску 9 мая ваенна-тэматычныя пляцоўкі будуць разгорнуты ў гандлёвым цэнтры «Першы Нацыянальны гандлёвы дом». У парку Перамогі з боку гасцініцы «Вікторыя» Міністэрства абароны возьме ўдзел у арганізацыі свята «Пераможны май». Сустрэцца з ваеннымі можна будзе і на ўрачыстых мерапрыемствах, што арганізоўваюцца на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Курган Славы». Асобную экспазіцыю прадставіць Міністэрства абароны і ў Мінскім міжнародным выставачным цэнтры. На пляцоўцы перад Палацам Рэспублікі напярэдадні гала-канцэрта «Вялікая Перамога» Міністэрства абароны пачастуе ўсіх салдацкай кашай у рамках праекта «Пераможная кухня». Акрамя таго, 10 мая на пляцоўцы Палаца спорту падчас сямейнага свята «Наша Перамога» жыхары і госці сталіцы таксама змогуць пачаставацца салдацкай кашай і пазнаёміцца з выстаўкай сучаснай ваеннай тэхнікі.

Гала-канцэрт «Вялікая Перамога» пачнецца 9 мая а 15 гадзіне на пляцоўцы каля Палаца спорту. У ім будуць удзельнічаць найлепшыя калектывы выканаўцаў краіны, а хэдлайнерам канцэрта стане папулярны расійскі выканаўца Дзяніс Клявер.

**Алена КРАВЕЦ.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»**

**Аукцион состоится 02.06.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**

**Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1** Грузопассажирский вагон GAZ 2705, 2013 г. в., регистрационный знак AI 0763-4, допустимая полная масса 3500 кг, свидетельство о регистрации САА 386083, дата выдачи 26.06.2013, номер кузова (рамы) X96270500D0752440, пробег – 325 677 км. Местонахождение автомобиля: Брестская область, г. Ивацевичи, 40 лет Октября, 3 |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 3 264 руб. (три тысячи двести шестьдесят четыре рубля) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1 –** 326 руб. (триста двадцать шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 29.05.2025 г. до 15.00** |

**Условия проведения аукциона:**
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 руб. с НДС за оценку 1 единицы техники.
3. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи выполненных работ от 14.02.2025 № 1 и протокола несостоявшегося аукциона от 14.02.2025 № 1 в размере 524,51 бел. руб. с НДС.
4. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи выполненных работ от 15.04.2025 № 1 и протокола несостоявшегося аукциона от 14.02.2025 № 1 в размере 524,51 бел. руб. с НДС

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды имущества, находящегося в хозяйственном ведении у РУП «Белпочта»**

**Аукцион состоится 10.06.2025 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

**Лот № 1:**

**Право заключения договора аренды помещения площадью 9,24 кв. м, расположенного на 1-м этаже изолир. помещения с инв № 710/D-52489 – отделение почтовой связи, по адресу: г. Бобруйск, ул. Горелика С.А., 58.**

Размер ежемесячной арендной платы – 6,93 б.а.в.
Срок заключения договора аренды 5 лет.

**Начальная цена продажи (и размер задатка): 43,36 бел. руб. с учетом НДС.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь и на торговой площадке Организатора аукциона Gostorg.by.

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел**: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте **gostorg.by**



**Плещеницкий сельский исполнительный комитет**
*в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*
РАЗЫСКИВАЕТ СОБСТВЕННИКОВ, НАСЛЕДНИКОВ И ЛИЦ, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **д. Слобода, ул. Центральная, д. 46** Плещеницкого сельсовета Логойского района Минской области (правообладатель – Петухова Евдокия Григорьевна).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В. И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-1-65.

УНП 600181684



Утерянные представительством Белгосстраха по Первомайскому району г. Минска бланки строгой отчетности квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов), формы 1-СУ, серии ВВ № 1638215-1638218 в количестве 4 экземпляра **считать недействительными.**

УНП 100122726

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ОАО «Н Холдинг»
## проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ***Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей*** | | | | | |
| **ЛОТ № 1** | Капитальное строение с инв. 500/С-25974, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кульман, 16/ 1. Площадь – 1350 кв. м, наименование – Здание кафе (лит. В 2/к), назначение – Здание специализированное для общественного питания, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000008006969 площадью 0,1982 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве аренды (срок действия: по 30.06.2028).<br>Объект недвижимости обременен правом аренды.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): охранные зоны линий электропередачи, площадь 0,0107 га, охранные зоны сетей и сооружений канализации, площадь 0,0245 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **3 221 357,69** | **Задаток, BYN** | **322 135,77** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»,<br>Республика Беларусь,<br>220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62<br>Тел. +375 (17) 388 90 99.<br>E-mail: mpovt@mpovt.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»,<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел.: 8029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты:<br>р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696.<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 16 мая 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **17 мая 2025 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |


# ТРЫАДЗІНСТВА НАШАЙ ПАМЯЦІ

Помнік «Жывая памяць удзячных пакаленняў», прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, адправілі з Мінска ў Маскву. Падобныя ўжо стаяць у Мінску і ў Брэсце.




Фота БелТА.

Праект «Жывая памяць удзячных пакаленняў» рэалізоўваецца па ініцыятыве дабрачыннага фонду Аляксея Талая. Першы помнік устаноўлены ў Мінску 2 ліпеня 2022 года, другі — 28 ліпеня 2024 года ў Брэсце.

Трэцюю скульптурную кампазіцыю праекта адправілі ў Маскву, дзе яна будзе ўстаноўлена на Паклоннай гары. «Пазней мы ўрачыста адкрыем гэту экспазіцыю з ускладаннем кветак. Пасля залівання ў Дрэва жыцця манет ад больш як 7 мільёнаў сем'яў з усёй постсавецкай прасторы і суайчыннікаў, якія жывуць за мяжой, гэта скульптурная кампазіцыя стане ўсенародным помнікам «Жывая памяць удзячных пакаленняў». Мы ганарымся тым, што паспеем да 9 мая прывезці ў Маскву і перадаць на ўрачыстае захоўванне гэты помнік як дар ад усяго беларускага народа. Мы таксама ганарымся тым, што так аб'ёмна і беспрэцэдэнтна па ахопе паўдзельнічалі нашы грамадзяне ў стварэнні гэтага помніка», — сказаў грамадскі дзеяч, паралімпіец, матывацыйны спікер і заснавальнік дабрачыннага фонду Аляксей Талай.

Ён звярнуў увагу, што за мяжой, у тым ліку ў некаторых еўрапейскіх краінах, зносяцца помнікі героям Другой сусветнай вайны. «Мы ж праяўляем на ўвесь свет свой стваральны патэнцыял. Мы не разбураем, не знішчаем гісторыю, а свята шануем і памятаем тых, хто змагаўся за Радзіму. Праз гэты праект, праз актыўнасць нашай грамадзянскай супольнасці мы транслюруем у свет тое, што мы адзіныя, непераможныя і гатовы адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы, дзяржаўную бяспеку, суверэнітэт і незалежнасць», — падкрэсліў грамадскі дзеяч.

Аўтар скульптурнай кампазіцыі народны мастак Беларусі Уладзімір Слабодчыкаў расказаў, як з'явілася ідэя помніка. «Ідэя нарадзілася ў мяне з пісьма майго бацькі. Я думаў, як зрабіць скульптуру незвычайнай. Лёс мне падарыў пісьмо, якое было ў нас у сямейным архіве, пісьмо майго таты сваім бацькам. Пісьмы — гэта і ёсць памяць, а памяць — гэта вяртанне да мінулага. Пісьмо салдата, якое прабіта кулямі, асколкамі і праляжала доўгі час у зямлі, з яго ідзе парастак дрэва. І таму атрымалася такая сімвалічная кампазіцыя», — адзначыў Уладзімір Слабодчыкаў.

Разам з помнікам у сталіцу Расіі даставяць чарговую партыю манет для адзінага сплаву, які будзе заліты ўнутр помніка. Свае манеты для помніка перадалі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

**Паводле БелТА.**

# НА АДНОЙ ХВАЛІ

## Адчуць эпоху і гонар

На частаце 96.2 пачало сваё вяшчанне «Радыё Перамога», якое з'яўляецца сумесным спецыяльным праектам «Альфа Радыё» і Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».

Аснову эфіру «Радыё Перамога» складаюць як арыгінальныя аўтарскія праграмы, так і трансляцыі радыёспектакляў, тэматычных праектаў, архіўных запісаў, вершаў, кампазіцый ваеннай тэматыкі. Тут можна пачуць знаёмыя многім пакаленням песні ў выкананні Клаўдзіі Шульжэнка, Леаніда Уцёсава, «Песняроў», Анатоля Ярмоленкі, Марка Бернеса і многіх іншых артыстаў. Але ідэя праекта, які злучыў усё гэта на адзінай платформе, узнікла ў стваральнікаў яшчэ ў 2023 годзе і была ў тым, каб аб'яднаць на адным канале тэматычныя матэрыялы, якія гучалі на «Альфа радыё» напярэдадні Дня Перамогі. Запусцілі інтэрнэт-паток. Па словах **начальніка аддзела радыёвяшчання «Альфа радыё» Вадзіма ШЭПЕТА,** праект атрымаў вялікі водгук з боку слухачоў, прычым як у нашай краіне, так і далёка за яе межамі.

— Нашы спасылкі пачалі распаўсюджвацца па агрэгатарах, таму мы вырашылі захаваць гэты інтэрнэт-паток. І літаральна праз год-паўтара міністр інфармацыі (тады Уладзімір Пярцоў) агучыў ідэю запусціць радыё «Перамога» ў FM-фармаце. З сярэдзіны 2024 года мы пачалі падрыхтоўку да гэтага тэхналагічнага працэсу. Усё атрымалася. І 25 красавіка бягучага года на частаце 96.2 FM у Мінску загучала «Радыё Перамога». На дадзеным этапе мы вяшчаем толькі на тэрыторыі сталіцы, — дзеліцца Вадзім Шэпет. — Акрамя песень пра Вялікую Айчынную вайну, у тым ліку і сучасных і ў прыватнасці беларускіх выканаўцаў, таксама ў нашым эфіры гучаць праграмы, запісаныя нашымі журналістамі, вершы пра вайну (іх чытаюць нашы госці, якія прыходзяць на ток-шоу «Будні»). Можна ў нас пачуць і легендарны голас Левітана. Прычым мы цяпер падабралі такую зводку, дзе па храналогіі набліжаемся якраз да Дня Перамогі. Там распавядаецца пра тыя крокі, якія ўжо ў той час рабіліся, каб наблізіць Перамогу. Можна ў нас пачуць і гісторыі стварэння песень ваеннага часу. У выніку атрымаўся такі сімбіёз, які дазваляе нашаму слухачу адчуць атмасферу і той эпохі, і пазнаёміцца з сучаснымі музычнымі творамі на ваенную тэму, а таксама прасякнуцца пачуццём гонару за тое, што мы з'яўляемся нашчадкамі пераможцаў.

Сёлета, калі святкуецца 80-годдзе Вялікай Перамогі, не абыдзецца без спецыяльнага напаўнення эфіру. Але аўтары праекта робяць стаўку на голас і інтанацыі ў змесце і ў танальнасцях расповеду пра мінулае, каб пасылы былі зразумелыя людзям незалежна ад узросту.




— Што датычыцца 9 Мая, то мы ўжо маем кантэнт, падрыхтаваны да гэтага свята. Асноўны ўхіл, скажу шчыра, мы робім на тое, каб у святочныя дні (і не толькі 9 Мая) мы слухалі песні Перамогі. Таму што для радыё музычны складнік першачарговы, — сказаў Вадзім Шэпет. — Вельмі хочацца, каб слухачы нашы адчулі атмасферу свята праз песні. Мы — нашчадкі пераможцаў, а менавіта праз песні найбольш можна перадаць пачуццё гонару. Вядома, ёсць некалькі праектаў у рабоце, дзе раскажам і пра зброю Перамогі, пра тэхніку таго часу, а галоўнае — будзем распавядаць пра герояў Перамогі.

Паслухаць «Радыё Перамога» можна на афіцыйным сайце radiopobeda.by альбо адшукаўшы радыёстанцыю ў першым нацыянальным радыёплэеры.

**Алена ДРАПКО.**


**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**

## ОАО «Компания «МогНат»

(Могилев, ул. Карла Маркса, 17)

**Торги состоятся 05.06.2025 в 11.00**
**на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**<u>Лот № 1:</u> Прицеп 2ПТС-4,**
г. в. – 1986, р/з БЮ 9135, инв. № по бух. учету 3004, заводской № – б/н.

***Начальная цена продажи: 4 000,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 400,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901. Срок внесения задатков и подачи документов для участия в торгах: по 03.06.2025 до 12.00. Победитель торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой.

Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения Победителя торгов, содержится в информации о проведении торгов, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за три календарных дня до даты торгов. Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25; Mogilev@ino.by.

Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

Мясцовае Самакіраванне
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
7 мая 2025 г. № 16 (797)




# У КОЖНЫМ КУТОЧКУ — СВЯТА

Дзень Перамогі для беларусаў у прамым сэнсе — свята жыцця, другі дзень нараджэння для ўсяго народа. Таму і адзначаем яго шырока, прыгожа, усёй краінай. Няважна дзе — у вялікім горадзе ці ў аддаленым аграгарадку — свята адчуваецца ўсюды. У гэтым пераканаліся ўласныя карэспандэнты «Звязды», пацікавіўшыся на месцах, як будуць адзначаць 80-годдзе Вялікай Перамогі.

**У пасёлку Усяж Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці сёння пражывае больш за 1,5 тысячы чалавек. Гэта адміністрацыйны цэнтр Усяжскага сельсавета, у склад якога, акрамя самога пасёлка, уваходзіць яшчэ больш за 20 населеных пунктаў.**

«Традыцыйна напярэдадні 9 Мая — свята Вялікай Перамогі — у сельскім Савеце праводзяцца ўрачыстыя мерапрыемствы. У нас, на жаль, ужо не засталося ветэранаў, але ёсць два былыя малалетнія вязні канцэнтрацыйных лагераў. Людзі ў паважаным узросце, сёння яны маюць патрэбу ў асаблівым клопаце. Пра іх мы ніколі не забываем, усяляк дапамагаючы не толькі ў святочныя, але і ў звычайныя дні. Для нас гэта сапраўды важна», — расказала **старшыня Усяжскага сельсавета Алена ШАБАН.**

Галоўнае мерапрыемства па святкаванні 9 Мая пройдзе ў пасёлку Усяж. У ім, паводле слоў старшыні сельсавета, актыўны ўдзел штогод прымае Усяжская сярэдняя школа, у якой сёння навучаюцца каля 200 чалавек, а таксама прадпрыемствы, размешчаныя на тэрыторыі пасёлка, сярод якіх — ААТ «ТБЗ Усяж». «Сёлета старт памятных мерапрыемстваў дасць сярэдняя школа. Разам з вучнямі, педагогамі, работнікамі прадпрыемстваў арганізаванай калонай мы рушым да помніка ваенных гадоў — брацкай магілы, размешчанай на тэрыторыі пасёлка. Там адбудзецца ўрачысты мітынг з ускладаннем кветак. Далей запланавана канцэртная праграма ў Усяжскім доме культуры. Мясцовыя калектывы будуць спяваць ваенныя песні, танцаваць, чытаць вершы. У цэлым, мы заўсёды стараемся далучаць да такіх мерапрыемстваў нашу моладзь, каб прыходзілі бацькі з дзецьмі», — паведаміла Алена Шабан.

Яна акцэнтавала — на тэрыторыі сельсавета знаходзіцца 18 воінскіх пахаванняў: «Да 9 Мая плануем аб'ездзіць усе, каб ушанаваць памяць людзей, якія аддалі свае жыцці за наша мірнае неба над галавой. Вядома ж, там адбудуцца ўскладанні кветак і вянкоў».

***

**Штогод у аграгарадок Заронава, што ў Віцебскім раёне, прыязджаюць сотні сваякоў воінаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі сельсавета. Дзень Перамогі тут, у невялікім аграгарадку пад Віцебскам, лічыцца самым галоўным і важным святам. Больш за 80 гадоў таму на гэтай тэрыторыі шэсць месяцаў стаяў фронт, на падступах да абласнога цэнтра загінулі тысячы савецкіх салдат. Ужо не адно дзесяцігоддзе памяць аб іх беражліва захоўваюць на Заронаўскім мемарыяле, дзе ўвекавечаны імёны звыш 10 тысяч байцоў, і ў мясцовым комплексным музеі «Гісторыя Заронаўскага краю».**

Не толькі напярэдадні 80-й гадавіны Перамогі, але і кожны год ініцыятыўныя мясцовыя жыхары, школьнікі і работнікі сацыяльных устаноў, якія функцыянуюць на тэрыторыі Заронаўскага сельсавета, з пачатку вясны добраўпарадкоўваюць воінскія пахаванні. На працягу некалькіх папярэдніх гадоў дзякуючы сумеснай ініцыятыве сельвыканкама і музея амаль на ўсіх пахаваннях



былі заменены старыя помнікі на новыя, наведзены парадак вакол. Сёлета аграгарадок стане пляцоўкай для правядзення раённага свята, прымеркаванага да 80-й гадавіны Перамогі нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Пазітыўныя змены ў добраўпарадкаванні закранулі не толькі памятныя месцы, але і ўсе населеныя пункты сельсавета. «9 мая запланаваны мітынг на Заронаўскім мемарыяле, пасля святочны канцэрт з удзелам артыстаў Віцебскага раёна. Будуць працаваць тэматычныя падворкі, выязны гандаль, дзіцячыя забаўляльныя пляцоўкі. Музей «Гісторыя Заронаўскага краю» традыцыйна на працягу дня будзе запрашаць на экскурсіі», — паведамілі ў Заронаўскім сельсавеце.

***

**Побач з вёскай Горня на тэрыторыі Бяседавіцкага сельсавета Хоцімскага раёна Магілёўшчыны стаіць цікавы помнік — вершнік на баявым кані — у гонар загінулых на гэтым месцы 16 жніўня 1941 года воінаў 112-га горна-кавалерыйскага палка 21-й горна-кавалерыйскай дывізіі. У Дзень Перамогі тут чакаюць родных палітрука Івана Гарабца — камандзіра кавалерыстаў, які загінуў разам з баявымі таварышамі і пахаваны ў брацкай магіле. Мяркуецца, што родныя героя далучацца да аўтапрабегу, які будзе арганізаваны ў гэты дзень з Хоцімска да помніка каля Горні.**

Па словах **старшыні Бяседавіцкага сельсавета Віталя КАВАЛЕНКІ,** на тэрыторыі знаходзіцца 10 памятных знакаў і тры воінскія пахаванні. Усе яны прыведзены ў парадак з удзелам мясцовых арганізацый, грамадскасці, жыхароў. Да ўсіх мясцоў смутку прыйдуць жыхары, каб ушанаваць памяць пераможцаў і ўскласці кветкі. У іх гонар прагучаць словы падзякі, а таксама — надзеі, што страшнае гора не паўторыцца і нашы дзеці ніколі не спазнаюць на сабе гэты жах.

— У бібліятэцы, якая знаходзіцца ў Бяседавічах, пройдзе гадзіна памяці, падчас якой моладзі раскажуць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны, — удакладняе старшыня сельсавета. — Там жа будзе арганізавана выстава. Невядомыя старонкі ваеннай гісторыі працягваюць адкрывацца. Адна з іх — пра самалёт ПЕ-2, які быў збіты непадалёк ад вёскі Батаева ў пачатку вайны. Сёлета імёны лётчыкаў будуць нанесены на гранітную пліту воінскага пахавання ў Хоцімску. У будучыні плануем устанавіць на месцы падзення самалёта таблічку з QR-кодам. Спадзяёмся, што родныя лётчыкаў таксама прыедуць да нас на Дзень Перамогі, каб пабываць на тым месцы, дзе скончыўся баявы шлях іх гераічных продкаў.

***

**Рабочы пасёлак Рэчыца Столінскага раёна Брэстчыны цалкам гатовы да святкавання Дня Перамогі. Цэнтральная плошча населенага пункта носіць сімвалічную назву — 40 гадоў Перамогі.**

— Тут і збяруцца 9 мая прадстаўнікі грамадскасці, працоўных калектываў, ветэраны і моладзь 6-тысячнага пасёлка, — расказаў **старшыня Рэчыцкага сельскага Савета Андрэй ДАМАШЧУК.** — На ўдзел у мітынгу запісаліся каля двух дзясяткаў устаноў і арганізацый. Гэта нашы буйныя прамысловыя прадпрыемствы — Камбінат будаўнічых матэрыялаў, вытворца кансерваў «Рольнік», таксама пасялковыя ўстановы адукацыі і аховы здароўя, прадстаўнікі чыгуначнай станцыі «Гарынь», вайскоўцы Пінскага пагранатрада і іншыя. Вучні абедзвюх рэчыцкіх школ возьмуць удзел у шэсці з партрэтамі продкаў у рамках акцыі «Беларусь памятае. Памятаем кожнага». Установы культуры падрыхтавалі адпаведную праграму.

— На жаль, у нас не засталося ніводнага ветэрана, — працягвае Андрэй Аляксандравіч. — Але мы згадаем пра іх стойкасць і мужнасць на кароткім жалобным мітынгу. Потым у іх гонар ускладзём кветкі да Вечнага агню на плошчы 40 гадоў Перамогі. Сваіх землякоў-франтавікоў, а таксама мірных жыхароў, што сталі ахвярамі вайны, мы памятаем не толькі ў святочныя дні. Матэрыялы па гісторыі ваеннага перыяду, успаміны, здымкі ўдзельнікаў вайны захоўваюцца ў школах. Там праводзяцца выхаваўчыя мерапрыемствы патрыятычнага кірунку. Сваім абавязкам лічым дагляд помнікі, што ўстаноўлены на нашай тэрыторыі. Акрамя помніка ў Рэчыцы, у нас ёсць два мемарыялы ў вёсцы Ніжні Церабяжоў і тры помнікі ваенным падзеям у вёсцы Варані. Усе яны дагледжаны, абноўлены, побач праведзена добраўпарадкаванне. Гэтай работай займаемся штогод. Правялі яе і сёлетняй вясной. Да кожнага з названых помнікаў у святочны дзень таксама будуць ускладзены кветкі. Ніхто не будзе забыты.

***

**Напярэдадні Дня Перамогі на тэрыторыі Лельчыцкага сельсавета Гомельшчыны ўжо праходзіць шэраг святочных мерапрыемстваў. Днямі невялікія святы з віншаваннямі і падарункамі арганізавалі дома для мясцовых старажылаў, малалетніх вязняў Вялікай Айчыннай — Вольгі Трафілеўны Хросцік і Аляксандры Лявонцьеўны Богуш.**

— Традыцыйна рыхтуем віншаванні разам з навучэнцамі Ліплянскай сярэдняй школы, работнікамі мясцовага дома культуры. Заўсёды прыязджаюць павіншаваць нашых паважаных старажылаў работнікі сельгаспрадпрыемства ААТ «Новая ніва», — расказала **старшыня Лельчыцкага сельвыканкама Алеся ХІЛЬКО.**

Да 80-й гадавіны Перамогі на тэрыторыі Ліплянскай сярэдняй школы заклалі «Сад надзеі». У гэтым годзе да 9 мая жыхары Лельчыцкага сельсавета прадоўжаць традыцыю правядзення аўтапрабегу па маршруце памяці.

— На тэрыторыі ў нас шэсць мемарыялаў і чатыры воінскія пахаванні ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Падчас аўтапрабегу каля кожнага мемарыяла праводзім мітынг, ушаноўваем памяць загінулых герояў, слова бяруць нашы старэйшыны, праходзяць невялікія канцэрты. Вельмі вялікі водгук на гэту ініцыятыву ў нашых жыхароў. Падтрымліваюць нас актывісты грамадскіх арганізацый, дэпутаты. Асабліва радуе, што з ахвотай удзельнічаюць дзеці, — адзначае Алеся Хілько.

Старшыня сельвыканкама расказала, што вучні Ліплянскай сярэдняй школы і педагогі напярэдадні 9 Мая заўсёды арганізуюць велапрабег да асобных воінскіх пахаванняў.

— Да Дня Перамогі абавязкова ладзім святочныя праграмы для жыхароў двух малых населеных пунктаў на тэрыторыі сельсавета — вёсак Чыяне і Пераможнае. Работнікі Ліплянскага дома культуры даюць выязныя канцэрты. Людзі заўжды рады. Вельмі цёпла заўжды праходзяць святы, — дадала суразмоўца.

Непасрэдна на 9 Мая ў цэнтры сельсавета аграгарадка Ліпляны ўпершыню ў рамках акцыі «Беларусь памятае» пройдзе шэсце мясцовых жыхароў з партрэтамі герояў Вялікай Айчыннай вайны. Вяскоўцы ўшануюць памяць пахаванага ў Ліплянах героя партызанскага руху Сяргея Кашырцава, згадаюць усіх франтавікоў, працаўнікоў тылу, малалетніх вязняў — ураджэнцаў і жыхароў сельсавета, раёна. У Ліплянах будзе арганізаваны і святочны канцэрт, а ва ўсіх населеных пунктах сельсавета прагучаць радыёканцэрты.

— Наш раён на самай граніцы з Украінай. Для нашых жыхароў сітуацыя ў суседняй краіне — нагляднейшы прыклад, які неацэнны мір, як важна захоўваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, каб перадаваць яе дзецям. Мусіць, менавіта таму для нашых людзей гэтыя майскія дні асаблівыя, гэта дні святой памяці.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
по продаже пустующего жилого дома в частную собственность
**в д. Заценье, д. 24,**
Каменского сельсовета Логойского района Минской области

| | |
|---|---|
| Форма проведения аукциона | Открытый |
| Наименование предмета аукциона | Жилой дом |
| Дата, время и место проведения аукциона | **12 июня 2025 года в 10.00,** аг. Камено, ул. Центральная, 7А, Каменский сельисполком, зал заседаний |
| Продавец, его адрес и телефоны | Каменский сельский исполнительный комитет, 223132, Минская область, Логойский район, аг. Камено, ул. Центральная, 7А тел.: 1774-72-3- 35;1774-72-3-81; А1 +375291700261. Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by |
| Местонахождение имущества | Минская область, Логойский район, д. Заценье, д. 24 |
| Общая площадь жилых помещений | 44,8 кв. м |
| Описание имущества | Одноэтажный, одноквартирный жилой дом, материал стен – дерево, деревянные перекрытия, крыша – шифер, сарай – 3 м х 9 м, имеется возможность подключения к водопроводной сети, электроснабжению |
| Условия аукциона по продаже пустующих домовладений | Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей | Одна базовая величина на день продажи |
| Сумма задатка и реквизиты продавца | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, получатель – Каменский сельисполком, расчетный счет (IBAN) BY42AKBB36006190711030000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 4805 |
| Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (без учета стоимости размещения извещения о проведении аукциона), бел. руб. | Объявление в газету |
| Адрес земельного участка | Минская область, Логойский район, д. Заценье, д. 24 |
| Площадь земельного участка | 0,231 га |
| Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Дата начала приема документов | С даты объявления аукциона |
| Окончательный срок приема документов | 9 июня 2025 года до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года № 844 п. 2, на основании решения Каменского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе представляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- копия платежного поручения о внесении суммы задатка;
- гражданин предъявляет – документ, удостоверяющий личность;
- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Каменским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязан:**

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- возместить затраты за организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона;
- подать заявление о предоставлении земельного участка.

После принятия соответствующего решения обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией

Свидетельство о государственной регистрации Частного производственно-торгового унитарного предприятия «**ЕВРОФЛЕКС**» (УП «**ЕВРОФЛЕКС**»), УНП 190431131, **считать недействительным в связи с его утерей.**

# ШТО ТАКОЕ ТГСы І НАВОШТА ЯНЫ ПАТРЭБНЫЯ?

## Разбіраемся на дэпутацкім узроўні

Вопыт беларускай сталіцы па рабоце дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета і акруговых саветаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (ТГС) можа быць узяты на ўзбраенне іншымі гарадамі Беларусі. Аб гэтым ішла размова на выязным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, у ходзе якой парламентарыі азнаёміліся з дзейнасцю тэрытарыяльных акруговых саветаў сталіцы.





Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — аўтары папраўак у Закон «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» — азнаёміліся з практыкай прымянення некалькіх артыкулаў закона на прыкладзе сталіцы. **Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН** сумесна з калегамі паказалі, як працуюць акруговыя саветы ТГС, якія дзейнічаюць толькі ў сталіцы, на прыкладзе Заводскага і Ленінскага раёнаў. Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Валянцін СЕМЯНЯКА**, задача гэтага выязнога пасяджэння — вывучыць практыку прымянення Закона «Аб змяненні закона па пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання» на прыкладзе горада Мінска. «Мы аўтары гэтага закона. І мы хочам паглядзець, як ён працуе», — падкрэсліў ён.

Акруговы савет ТГС — новая форма самакіравання, якой крыху менш за год. Перад кожным саветам ТГС (а іх 60, па колькасці выбарчых акруг у сталіцы) стаіць шмат задач. Сярод іх — садзейнічанне Мінгарсавету ў зборы і апрацоўцы інфармацыі аб развіцці акругі; наладжванне ўзаемадзеяння грамадзян, адміністрацыі раёна, суб'ектаў гаспадарання і грамадскіх фарміраванняў па пытаннях развіцця і добраўпарадкавання тэрыторыі; удзел у інфармаванні жыхароў па пытаннях мясцовага значэння, збор і абагульненне прапаноў грамадзян; аказанне садзейнічання ў фарміраванні грамадзянскіх ініцыятыў.

Пасля знаёмства з дзейнасцю ТГСаў парламентарыі абмеркавалі тэму ў рэдакцыі газеты «Вечерний Минск». Арцём Цуран расказаў, адкуль наогул з'явіліся такія формы грамадскага самакіравання, як ТГС і КОТГС: «За аснову работы такіх органаў кіравання мы ўзялі сельсавет. Вядома, што на тэрыторыі горада Мінска няма сельсаветаў. Існуюць, вядома, адміністрацыі раёнаў. Пры гэтым у Партызанскім раёне сёння пражывае каля 85 тысяч чалавек, у Фрунзенскім — 470 тысяч. І тады паўстае пытанне: як сіламі адной толькі адміністрацыі раёна вырашаць пытанні тысяч жыхароў? Таму і быў абраны шлях работы мясцовых дэпутатаў, бо гэта самае дробнае тэрытарыяльнае дзяленне. У Мінску 60 акруг — 60 дэпутатаў у Мінгарсавеце. Сярэдняя колькасць выбаршчыкаў у акрузе — ад 18,5 да 24 тысяч чалавек».

Арцём Цуран падрабязна расказаў пра ўклад Мінгарсавета і прадстаўнікоў мясцовых органаў улады ў работу ТГС. Ён растлумачыў, што ў кожнай выбарчай акрузе па выбарах гарадскіх дэпутатаў працуе савет ТГС, маецца памяшканне, дзе знаходзіцца спецыяліст, які адказвае за гэтую работу. Як правіла, гэта памочнік дэпутата Мінгарсавета, прамая падпарадкаванасць у яго — адміністрацыі раёна. У гэтых памяшканнях арганізаваны і прыёмы грамадзян.

На прыкладзе Адоеўскага акруговага савета ТГС старшыня Мінгарсавета расказаў аб арганізацыі ўзаемадзеяння з насельніцтвам: «У склад савета ўваходзяць 18 чалавек: дэпутат, яго памочнік, начальнік аддзела гарадской гаспадаркі адміністрацыі Фрунзенскага раёна, кіраўнікі шасці ўстаноў адукацыі, дзвюх устаноў аховы здароўя, чатырох прадпрыемстваў, першы сакратар Фрунзенскай раённай арганізацыі БРСМ, старшыня КОТГС і старшы па доме або па двары. За май 2024 года — красавік 2025 года прадстаўнікамі ТГС было праведзена больш за 100 сустрэч са старэйшымі па дамах, кантактнымі асобамі і насельніцтвам. На дадзены момант пагадзіліся на ўзаемадзеянне каля 85 % прадстаўнікоў жылых дамоў. З мая 2024 года саветам вырашана 94 пытанні насельніцтва, 22 з іх застаюцца на кантролі. За гэты ж перыяд вырашана 3293 пытанні ў цэлым па горадзе. З іх — 2560 пытанняў у сферы ЖКГ, 106 — у галіне сацыяльнай абароны, 93 — пытанні гандлю і паслуг, 53 — са сферы будаўніцтва, 51 — сістэмы адукацыі; 27 пытанняў датычыліся аховы здароўя, 403 — з іншых сфер. Як бачым, сістэма працаздольная».

У Год добраўпарадкавання, пяцігодку якасці вельмі важна якаснае выкананне абавязкаў на ўсіх узроўнях. Такім меркаваннем падзяліўся з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Валянцін Семяняка: «Гэта датычыцца і Палаты прадстаўнікоў адносна якасці заканадаўчай дзейнасці. А каб якасна карэкціраваць законы, трэба разумець, як яны працуюць. Таму і праводзяцца такія выязныя пасяджэнні і іншыя мерапрыемствы».

Паводле яго слоў, такія формы, як ТГС і КОТГС, дастаткова добра прыжыліся ў Мінску: «Гэта па сутнасці справы добры сімбіёз паміж дэпутатамі Мінгарсавета, іх памочнікамі, прадстаўнікамі іншых органаў тэрытарыяльнага самакіравання. У выніку наладжанай работы жыццё грамадзян акругі становіцца лепшым, а вырашэнне праблем дасягаецца больш хуткім і эфектыўным спосабам. Статыстыка вынікаў разгляду зваротаў грамадзян у акруговых саветах паказвае, што ўсе звароты не застаюцца па-за ўвагай. Кожнае пытанне або растлумачана, або вырашана станоўча. Гэта вельмі добры вынік, які сведчыць, што гэтая навацыя закона працуе дастаткова эфектыўна».

Валянцін Семяняка адзначыў вялікую работу, якую правёў Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў у гэтым скліканні: «Магчыма, вопыт будзе распаўсюджаны і на іншыя гарады, бо ідзе досыць добры сінергічны эфект узаемадзеяння дэпутата гарадскога савета, спецыялістаў ТГС, членаў КОТГС. Вядома ж, з грамадзянскімі ініцыятывамі — мы ў пачатку гэтага шляху, і ў кожнага рэгіёна свая спецыфіка. У Мінску раней такога не было. Людзі адчуюць эфект, і гэта будзе сур'ёзнай дапамогай для вырашэння мясцовых праблем».

Падводзячы вынікі, старшыня Пастаяннай камісіі падкрэсліў: «За год з невялікім, з моманту ўступлення закона ў сілу, гэта добры вынік. Мы ўбачылі, што мадэль, якую мы стварылі, жыццяздольная і эфектыўная».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**фота аўтара.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# ДОБРАЯ СПРАВА АБ'ЯДНОЎВАЕ

## Дэпутаты бягучага і папярэдняга скліканняў навялі парадак каля школы ў Фрунзенскім раёне сталіцы

**У рамках акцыі «Разам на добрую справу», ініцыяванай членам Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Анжалікай КУРЧАК, дэпутаты цяперашняга, IV і VII скліканняў, жыхары выбарчай акругі і навучэнская моладзь добраўпарадкавалі каньён каля сярэдняй школы № 49.**



Пра тое, што гэта месца мае патрэбу ў добраўпарадкаванні, дэпутату паведамілі жыхары найбліжэйшых дамоў. Як высветлілася, яно карыстаецца вялікай папулярнасцю ў насельніцтва, але да нядаўняга часу выглядала закінутым. Каб самастойна ацаніць аб'ём работ, парламентарый выехала на месца.

— Калі я наведала каньён, то ўбачыла камень, на якім было напісана, што алея, якая ўпрыгожвае гэта месца, была высаджана дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў IV склікання ў красавіку 2012 года, — падзялілася Анжаліка Курчак. — Гэта стала штуршком для таго, каб кінуць кліч і сабраць тут усіх: дэпутатаў цяперашняга і мінулых скліканняў, неабыякавых мясцовых жыхароў, педагогаў і вучняў сярэдняй школы № 49, а таксама супрацоўнікаў дзіцячага садка № 122 для прадаўжэння гэтых выдатных традыцый і наладжвання сувязі пакаленняў.

Усе запрошаныя з радасцю адгукнуліся на прапанову навесці тут парадак. Да пачатку акцыі «Зелянбудам» Фрунзенскага раёна былі праведзены работы па ачыстцы мясцовасці ад лішняй хмызняковай расліннасці. Усім астатнім засталося пафарбаваць лавачкі, падмесці і прыбраць старое лісце.

Работы прымеркаваны яшчэ і да 80-годдзя Вялікай Перамогі, бо, па словах дэпутата, важна сустрэць гэта свята ў чыстай і прыгожай краіне.

— Нядаўна Прэзідэнт сказаў, што Мінск павінен быць узорна-паказальным горадам, — канстатавала член Пастаяннай камісіі. — І мы бачым, як сталіца з кожным годам становіцца ўсё прыгажэйшай, як змяняецца яе архітэктура, паляпшаюцца ўмовы жыцця. І самая галоўная заслуга ў гэтым саміх жыхароў сталіцы, якія выходзяць на такія акцыі па покліч сэрца.

Удалося паразмаўляць і з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў IV склікання, заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь Святланай Сухавей, якая 13 гадоў таму закладвала ў гэтым месцы алею.

— Памятаю, у той дзень было добрае надвор'е, — падзялілася яна. — Мы з задавальненнем пасадзілі дрэвы, прыбралі тэрыторыю. Але мінула шмат часу, і трэба зноў навесці парадак. Я вельмі рада, што нас прыцягнулі да гэтай акцыі і мы можам такой добрай справай прынесці карысць нашаму гораду ў Год добраўпарадкавання.

Сярод удзельнікаў акцыі была і дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу VII склікання Марыя Васілевіч, якая таксама з радасцю адгукнулася на запрашэнне паўдзельнічаць у акцыі.

— Калі больш за чатыры гады адказваеш за гэту акругу, зямлю, вядома, хочацца, каб і потым яна таксама была ў чысціні, — лічыць яна. — Немагчыма ставіцца да яе як да нейкай чужой.

Па словах Марыі Васілевіч, вельмі важна, што такія мерапрыемствы збіраюць прадстаўнікоў розных пакаленняў.

— Гэта, вядома, вялікая магутная сіла, калі моладзь працуе сумесна з больш дарослым, вопытным пакаленнем, — адзначыла дэпутат папярэдняга склікання. — Ведаю аб гэтым па сваім досведзе работы ў Палаце прадстаўнікоў, дзе была самым маладым дэпутатам. Калі маладыя людзі са сваім запалам, энтузіязмам, энергіяй сустракаюцца з мудрасцю і вопытам дарослага пакалення, то ў выніку атрымліваецца ідэальны баланс.

Пасля сумеснай працы каньён зноў стаў чыстым і добраўпарадкаваным. Вясна ўступае ў свае правы, і ўсё навокал упрыгожыла яркая зеляніна дрэў.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**




ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом **комплекса имущества (ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ И ОБОРУДОВАНИЯ) Узденского производственного участка ОАО «Слуцкий сыродельный комбинат»** в составе:

| № п/п | Наименование |
|---|---|
| | **Здания и сооружения** |
| 1 | Главный производственный корпус, пл. 3 592,8 кв. м, инв. № 623/С-1096 (составные части и принадлежности: теневой навес, пристройка – 4 шт., навес, забор) |
| 2 | Гаражи, пл. 614,6 кв. м, инв. № 623/С-1097 (составные части и принадлежности: пристройка – 3 шт.) |
| 3 | Здание котельной, пл. 332,2 кв. м, инв. № 623/С-1098 (составные части и принадлежности: пристройка – 2 шт.) |
| 4 | Здание для мойки мусорных контейнеров, пл. 14 кв. м, инв. № 623/С-60710 (составные части и принадлежности: площадка для мусора) |
| 5 | Проходная, пл. 20,2 кв. м, инв. № 623/С-60709 |
| 6 | Дезбарьер, инв. № 623/С60711 (составные части и принадлежности: площадка) |
| 7 | Градирня (инв. № 000006У), пл. 42 кв. м, инв. № 623/С-60941 |
| 8 | Водонапорная башня (инв. № 000004У), высота 21,15 м, пл. 10,6 кв. м, инв. № 623/С-60930 |
| 9 | Противопожарная емкость, пл. 44 кв. м, инв. № 623/С-60931 |
| 10 | Противопожарная емкость, пл. 30 кв. м, инв. № 623/С-60932 |
| 11 | Артскважина, инв. № 623/С-60951 (инвентарный номер 000011У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 12 | Артскважина, инв. № 623/С-60952 (инвентарный номер 000012У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 13 | Артскважина, инв. № 623/С-60953 (инвентарный номер 000013У) (составные части и принадлежности: павильон для пульта управления) |
| 14 | Линия ЛЭС, протяженность 793,3 м, инв. № 623/С-60940 |
| 15 | Площадные сети канализации, протяженность 515,9 м, инв. № 623/С-60939 |
| 16 | Площадные сети водопровода, протяженность 668,2 м, инв. № 623/С-60938 |
| | **Оборудование** |
| 17 | Котел паровой Е-1.0-09-ГЗ, 1992 г. в., заводской № 13051, рег. № 25-21-836, инв. № 000185У |
| 18 | Котел паровой с газовой горелкой:<br>- котел паровой стальной КП-4.0-0.9, 2012 г. в., зав. № 37, рег. № 25-21-0838;<br>- горелка газовая ГБГ-3.5-0.5, зав. № 180, инв. № 000456У |
| 19 | Система учета газа в комплекте, инв. № 000457У |
| 20 | Система водоподготовки в комплекте с автоматикой, инв. № 000455У |
| 21 | Подогреватель-теплообменник размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000066У |
| 22 | Подогреватель-теплообменник размеры: 3,5*0,3 м, инв. № 000067У |
| 23 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000501У |
| 24 | Горелка газовая блочная ГБ-0.85-0.1 (к котлу Е-1.0-09ГЗ), инв. № 000502У |
| 25 | ГРУ котельной (газорегулирующая установка), инв. № 000271У |
| 26 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, двустенный, объем V=50 куб. м, инв. № 000375У |
| 27 | Резервуар для хранения молока из нержавеющей стали, одностенный, объем V=5 куб. м, инв. № 003424 |
| 28 | Резервуар РВ-5 из нержавеющей стали одностенный объем V=5 куб. м, инв. № 991001245 |
| 29 | Точка доступа ISCO-802/11a: автоматическая система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ), инв. № 000485У |
| 30 | Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг, с индикатором весоизмерительным Newton NT-200A, инв. № 000332У |
| 31 | Весы платформенные электронные НПВ=5000 кг с индикатором весоизмерительным CAS СИ-2001А, инв. № 000428У |
| 32 | Емкость для хранения молока: из нержавеющей стали, одностенная, объем V=5 куб. м, инв. № 000316У |
| 33 | Агрегат электронасосный ЭЦВ 6-6.5-120, инв. № 000019У |
| 34 | Резервуар Я1-ОСВ-4 (для хранения сливок): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=4 куб. м, инв. № 000161У |
| 35 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000265У |
| 36 | Резервуар Я1-ОСВ-6 (для хранения сыворотки): из нержавеющей стали, двустенный, объем V=6 куб. м, инв. № 000266У |

Объекты недвижимости **№№ 1–10, 15** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625650100005000060** *(право постоянного пользования, площадь 2,0535 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пер. Колхозный, 13. *Участок расположен в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0521 га.*

Объект недвижимости **№ 11** расположен на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000012** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,1139 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 21. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения на площади 0,1139 га).*

Объекты недвижимости **№№ 12, 13** расположены на земельном участке с кадастровым номером **625684200009000011** *(право аренды по 16.02.2073, площадь 0,4306 га)* по адресу: Минская обл., Узденский р-н, Узденский с/с, 20. *Земельный участок имеет ограничения в использовании в связи с расположением на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения) на площади 0,4306 га, в охранной зоне электрических сетей напряжением до 1000 вольт на площади 0,0320 га, в придорожной полосе (контролируемой зоне) автомобильной дороги на площади 0,4306 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **1 042 713,60 бел. руб**.

Задаток 10 % от начальной цены – **104 271,00 бел. руб.**

**Стоимость снижена на 60 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 13.12.2023, 31.01.2024, 23.05.2024, 16.07.2024, 03.09.2024, 19.10.2024, 21.12.2024, 05.02.2025.

Аукцион состоится **05.06.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.06.2025** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефоны для осмотра: (8044) 738-42-04, (801718) 55-0-25.**

УНП 600119098

ДОБРЫ ПРЫКЛАД

# ІДЭІ МІЖНАРОДНАГА МАШТАБУ

## У Крычаве моладзь Беларусі і Расіі абмянялася інфармацыяй пра добрыя справы на карысць Радзімы

Маладзёжны міжрэгіянальны форум «Што ты зрабіў для Радзімы», які чатыры гады таму нарадзіўся ў Мсціславе, гэтым разам пабываў у Крычаве. Прыехалі юнакі і дзяўчаты з дзесяці раёнаў Магілёўскай вобласці і пяці — Смаленскай. Як заўсёды, было пазнавальна, эмацыянальна і змястоўна.



Крычаў — горад патрыятычны, тут шмат месцаў, звязаных з воінскай славай. Некалькі новых з'явілася ў апошнія гады дзякуючы актыўнай дзейнасці Маладзёжнага савета пры Крычаўскім райсавеце. Дастаткова ўспомніць «Гераічны летапіс Крычаўшчыны», які быў прызнаны адным з найлепшых на рэспубліканскім узроўні праектаў і прафінансаваны. На прэмію крычаўская моладзь зрабіла перасоўную выставу, дзе можна па фота і дакументах прасачыць, як змагаўся раён у гады ліхалецця. Сёлета крычаўскія актывісты зрабілі яшчэ адну выставу да 80-годдзя з Дня Перамогі — «Героі Вялікай Перамогі» аб сваіх земляках — Героях Савецкага Саюза. Іх на Крычаўшчыне тры і яшчэ адзін кавалер ордэна Славы трох ступеняў.

